PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 8 (2441) Год XLVIII Беласток, 23 лютага 2003 г. Цана 2,00 зл.

Упаўнаважаны, не заступнік

Размова з Маркам ЛІБЭРАДЗКІМ, нованазначаным упаўнаважаным падляшскага ваяводы па справах нацыянальных меншасцей.

— Чаго можа чакаць беларуская меншасць ад Вашай дзейнасці?

— Перш за ўсё хачу падкрэсліць, што я — упаўнаважаны ваяводы, а не заступнік меншасці, як ужо некаторыя да мяне звярталіся. Пасля некалькіх дзён выконвання мною службовых абавязкаў пачуў я галасы, што ў адносінах да маёй асобы ўзрастаюць вельмі высокія чаканні. Я — выключна дзяржаўны чыноўнік, які мае акрэсленыя, вызначаныя дзеянні. У гэтым кантэксце, у сваіх чаканнях меншасныя асяроддзі, хоць бы беларускія, павінны прымаць пад увагу, што я — не заступнік меншасцей, а выключна ўпаўнаважаны ваяводы...

— Значыць, чаго можна чакаць ад дзеянняў упаўнаважанага?

— Маё заданне перш за ўсё — ведаць, што дзеецца ў меншасных асяроддзях, кантактавацца з імі, размаўляць, ведаць іх праблемы, патрэбы, пастулаты, і інфармаваць аб гэтым ваяводу. Вядома, калі я буду лічыць гэта настолькі важным, што павінен гэтым заняцца ваявода. Варта тут успомніць, што ад 1998 года, ад увядзення рэформы адміністрацыі дзяржавы, агромная частка заданняў — у руках войтаў, бурмістраў, прэзідэнтаў, старастаў, ці ўрэшце маршалкаў ваяводстваў. А заданні ваяводы — дакладна акрэслены законам і толькі ў тых межах магу рухацца. Маё заданне — перш за ўсё ведаць. Гарантую, што патрэбы асяроддзяў нацыянальных меншасцей нашага рэгіёна, іх праблемы да ваяводы будуць даходзіць. Магчыма, калі я буду лічыць, што даная справа будзе патрабаваць умяшальніцтва звонку, медыяцыі ў спрэчных справах асобы звонку, эмацыянальна неангажаванай у спрэчку, гэта таксама буду рабіць — гэта таксама маё заданне. Адным з маіх заданняў — уплыванне на фармаванне адлюстравання вобразу нацыянальных меншасцей у мясцовых медыях. Мушу, значыць, ведаць, як ён выглядае, бо, можа, акажацца, што ўсё ў парадку і няма патрэбы якога-небудзь умяшання. У меншасцей ёсць свае часопісы — беларуска-, літоўска- і ўкраінскамоўныя, радыёперадачы, створаныя журналістамі, якія ідэнтыфікуюцца з паасобнымі меншасцямі ці якія з іх паходзяць. Ёсць, урэшце, і тэлеперадача нацыянальных меншасцей. Значыць, з тым адлюстраваннем меншасцей у медыях не найгорш, ну, можа, па-за польскамоўнымі медыямі, дзе часам дзейнічаюць нейкія стэрэатыпы. Калі штосьці такое будзе мець месца, буду такім рэдакцыям звяртаць увагу, бо

[працяг ☞ 3]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Педсавет Чыжоўскай школы з выдатнікамі па беларускай мове

Спрыяльная атмасфера для роднай мовы

Аляксей Мароз

У Комплексе школ у Чыжах многа ўвагі адводзіцца актыўнаму выхаванню дзяцей і моладзі. Арганізуюцца тут разнародныя мерапрыемствы, пры якіх моладзь супрацоўнічае з жыхарамі Чыжоўскай гміны. Бацькі вучняў актыўна ўключаюцца ў працу школы.

Школьныя праекты

Зараз канчаецца рэалізацыя праекта „З кацельні святліца", які дазволіў прыспасобіць памяшканне ў падвале школы на святліцу. Будуць сустракацца ў ёй вучні пасля заняткаў і чакаць ад'езду дадому. Раней школа атрымала сродкі на рэалізацыю праекта „Як сапраўдныя журналісты". Паўстаў тады рэдакцыйны калектыў, у які апрача настаўніцы Яўгеніі Навіцкай увайшлі вучні ўсіх класаў, з мэтай выдавання школьнай газеткі. Рыхтуецца ўжо шосты нумар часопіса і вучні, якія пішуць артыкулы, здабываюць вопыт патрэбны для журналісцкай працы. У каляровай і прыгожай газетцы змяшчаюць інфармацыі пра школьныя мерапрыемствы, размовы з цікавымі людзьмі і школьны гумар. Рэдакцыя газеткі атрымала вылучэнне і дыплом на II Журналісцкім форуме, арганізаваным у Беластоку для вучняў 49 школ.

— Думка аб рыхтаванні праектаў і развіванні ў школе пазакласнай работы паявілася пасля сустрэч, арганізаваных у Беластоку Фондам развіцця лакальнай дэмакратыі. Паявілася там ідэя стварэння пры школах Цэнтраў лакальнай актывізацыі. Такі цэнтр паўстаў і пры нашай школе. На курсах арганізаваных фондам 6 нашых настаўнікаў навучыліся пісаць праекты і атрымалі адпаведныя дыпломы. Пасля мы супольна пачалі пісаць праекты і выступаць са школьнымі ініцыятывамі. Да нашай дзейнасці стараліся прыцягнуць бацькоў, — заяўляе дырэктар Комплексу школ у Чыжах Міраслаў Пяткевіч. — У пазакласнай працы ахвотна ўдзельнічае моладзь. Прывыкае яна да працы ў карысць асяроддзя і ўзбагачае веды аб сваіх мясцовасцях і наваколлі.

Некалькі гадоў таму, у рамках праекта „Традыцыя нам блізкая" меў адкрыцца ў старым будынку гміннай установы рэгіянальны музей. Аднак школа не атрымала сродкаў на рэалізацыю праекта і выступіла з яго часткай, звязанай з арганізацыяй „Куцці", у Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь за грантамі. Першы год „Куцця" арганізавана была дзякуючы грантам, а зараз, як і іншае беларускае мерапрыемства „Масленіца", ладзіцца школьнымі сіламі. У Чыжоўскай школе займаюцца таксама экалагічнай дзейнасцю. Нядаўна падрыхтавалі праект „На паратунак вадзе", які прадбачвае рэалізацыю ў школе экалагічных інвестыцый. Звязаны будуць яны з ашчаднасцямі ў выкарыстанні вады. Вучні падрыхтавалі „Зялёную кнігу Чыжоўскай гміны" з інфармацыяй аб мясцовай прыродзе. На карце гміны прадстаўлены месцы цікавыя для турыстаў.

Мерапрыемствы для жыхароў гміны

У Комплексе школ у Чыжах арганізуюцца мерапрыемствы, на якія запрашаюцца жыхары гміны. Свае поспехі ў вучобе і пазакласнай дзейнасці вучні паказалі ў час Адкрытых дзён школы, якія за-

[працяг ☞ 2]

Заснежанае Гродна ☞ 2

У адрозненне ад Беластока, у Гродне дарожныя і камунальныя службы амаль не пасыпаюць вуліц і тратуараў соллю. Са снегам змагаюцца там традыцыйнымі метадамі — мятлой і лапатай. Бывае часам слізкавата, але можна хадзіць па белых тратуарах, без ліпкай гразі пад нагамі.

Пашырыць не рашыліся ☞ 3

Дарота Радзівіл з Міністэрства асяроддзя абяцала даслаць Саюзу гмін Белавежскай пушчы інфармацыі аб біясферных запаведніках. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк запрапанаваў адтэрмінаваць да канца лютага рашэнне наконт пашырэння тэрыторыі Біясфернага запаведніка. Да гэтага часу будуць праведзены кансультацыі з раднымі прыпушчанскіх гмін, якія будуць вырашаць справы запаведніка.

Азіяцкі аспект ☞ 4

Злучаныя Штаты Амерыкі заснавалі выхадцы з асветніцкай Еўропы не як нейкае царства, але як дзяржаву якая прадстаўляе інтарэсы яе грамадзян. І з таго часу не было там нейкай рэвалюцыі, якая б той парадак змяніла. У нашай ментальнай прасторы парадак зусім іншы. Наш менталітэт сфармаваны маскоўскай дзяржавай.

Надзеленыя залатымі рукамі ☞ 5

На кафедры народных рамёстваў працуюць вучэбныя майстэрні ганчарства і керамікі, ткацтва, габелена, баціка, саломапляцення, малюнку, алейнага і акварэльнага жывапісу. Цяпер па спецыялізацыі навучаецца 169 студэнтаў на стацыянарным і 89 на завочным аддзяленнях. Кафедра дала чатыры выпускі спецыялістаў, якія працуюць на розных аб'ектах сферы культуры Беларусі.

Выпрабаванне цудам ☞ 9

Кроватачывасць іконы Збавіцеля аб'явілася ў доме простай сялянкі рабы Божай Антаніны ў вёсцы Дзяржавіна Арэнбургскай вобласці 5 красавіка 1998 г. Паступова кроватачэнне ўзмацнялася і стала выходзіць з ілба, ад калючак цярновага вянка Госпада. У цяперашні момант выява так заліта выдзяленнямі, што амаль не відаць твару.

Жаўруковы спеў Уладзіміра Мулявіна ☞ 10

У 1980 г. урад Польшчы ганаруе Мулявіна высокм тытулам заслужанага дзеяча культуры гэтай дзяржавы. Факт гэты вельмі паказальны, бо тое, што сцвярджаў на беларускай глебе мастацкі кіраўнік „Песняроў", было актуальным і для сумежнага славянскага народа.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Заснежанае Гродна

Зіма ў гэтым годзе дакучае не толькі жыхарам Польшчы. У суседняй Беларусі снегу на пачатку лютага было не менш чым у нас, але ў сродках масавай інфармацыі не выклікала гэта сенсацыі, тэлебачанне не паказвала снегу ў якасці галоўнай тэмы дня. Зіма ў лютым успрымаецца ў Беларусі як нармальная прыродная з'ява. У Гродне снег ішоў багата і пастаянна больш за тры дні, было яго вышэй за паўметра, але сярод жыхароў горада не адчувалася нараканняў па гэтай прычыне. Раніцай нехта расчышчаў тратуары, пад'езды, аўтобусныя і тралейбусныя прыпынкі. Позняй ноччу на вуліцы выязджалі грузавікі і вывозілі кучы снегу за межы горада. Цэнтр Гродна, а асабліва старажытны квартал, раніцай быў падрыхтаваны да нармальнага жыцця. На перыферыях горада было значна горш, але аўтобусы ездзілі нармальна, а прыватныя аўтамабілі ў залежнасці ад адвагі іх вадзіцеляў.

У адрозненне ад Беластока, у Гродне дарожныя і камунальныя службы амаль не пасыпаюць вуліц і тратуараў соллю. Са снегам змагаюцца там традыцыйнымі метадамі — мятлой і лапатай. Бывае часам слізкавата, але можна хадзіць па белых тратуарах, без ліпкай гразі пад нагамі. Хаця ў Беларусі гарадскі транспарт амаль дармовы, але карыстацца ім зімою вельмі нявыгадна. Шмат людзей ездзіць аўтобусамі і тралейбусамі. Пяшком прайсціся па белым і сухім снезе гэта прыемнасць, якой не сустракаецца на пасоленых тратуарах Беластока.

Гродна ад Беластока ў 60 кіламетрах. Надвор'е і клімат тыя ж. Але людзі апранаюцца зусім інакш. У Беларусі на галовах жыхароў дамінуюць салідныя шапкі „вушанкі" з натуральнай і штучнай скуры. Носяць іх мужчыны і жанчыны. Апрача таго шмат жанчын носяць футры, якія нашы дамы апранаюць ідучы ў царкву ці касцёл. Мужыкі таксама апрануты так, каб быць гатовымі абараняцца ад трыццаціградуснага марозу.

Апрача зімовай вопраткі жыхары Гродна розняцца ад беластачан таксама мовай. На вуліцы, у крамах і ўстановах дамінуе руская. Беларускую мову можна пачуць таксама рэдка, як у Беластоку. Аднак можна на ёй кантактавацца з рускамоўным светам. Беларуская, у адрозненні ад Мінска, раздражняе ў Гродне мала каго — найчасцей моладзь, якая імкнецца чырыкаць з маскальскім акцэнтам. У Гродне чамусьці такая расейшчына гучыць вельмі штучна. Славутая трасянка быццам стала мовай дамінуючай часткі насельніцтва. Аднак звяртаючыся на беларускай мове можна быць упэўненым, што наш гродзенскі суразмоўца не стане прыкідвацца, што нас не разумее. У Мінску такая дэманстрацыя пагарды для аднае з дзяржаўных моў — з'ява нярэдкая.

Гродна даволі хутка еўрапеізуецца. У рэстаране „Беласток" афіцыянткі, апранутыя ў прыгожыя уніформы, амаль бегаюць па зале выконваючы сваю працу. Таму нават пры вялікай колькасці гасцей можна з'есці абед і заплаціць рахунак у 20 мінут з моманту ўваходу ў рэстаран. Праўда, у прадуктовых крамах часта можам сустрэць савецкі падыход да працы, але такіх 20-гадовых „дзевушак" можам таксама сустрэць за прылаўкамі крамаў Беластока ці Варшавы. Відаць, не пераносяць яны свае працы, хамаватага працадаўцы і ўсіх кліентаў крамы, што даюць зарабіць яе ўласніку. У вялікім дзяржаўным універмагу ў Гродне, дзе хацелася мне набыць вопратку, дзве прадаўшчыцы дапамагалі выбіраць адпаведны тавар з такой ангажаванасцю, як у салоне моды па вуліцы Ліповай у Беластоку. Проста цяжка адысці ад прылаўка і нічога не купіць.

Мяне як гісторыка прыемна ўразіла ў Беларусі даступнасць да архіўных матэрыялаў. Найбольш сакрэтныя дакументы НКУС можна нават ксераваць за адпаведную плату. Карыстаюцца імі ў большасці палякі, мясцовых гісторыкаў як бы праблемы фарміравання бальшавіцкай улады менш цікавяць. У Польшчы доступ да матэрыялаў, якія кампраметавалі б дзяржаўную ці нацыянальную палітыку значна больш абмежаваны. І самае прыемнае ў працы наведвальнікаў гродзенскіх архіваў — адпаведныя папкі трапляюць на рукі даследчыка ў пяць мінут пасля выпісу патрабавання. У варшаўскіх архівах трэба падаць адпаведныя дакументы дзень раней, а няспешнасць і пышлівасць тамашніх супрацоўнікаў напамінае эмацыянальны стан мінскіх пастарэлых чэкістак, застаўленых пільнаваць уваход у Нацыянальную бібліятэку. На гэтым фоне кампетэнтнасць гродзенскіх архівістак (у архівах працуюць выключна жанчыны) прыемна ўражвае.

Яўген Мірановіч

Бег на месцы

У Беларусі накал выбарчай барацьбы, напэўна, дасягнуў свайго апагея. На 2 сакавіка прызначаныя выбары ў мясцовыя органы ўлады і зараз ідзе кампанія зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты. Але калі для адных мэтай выбараў выключна дэпутацкае месца, то для іншых толькі ўдзел у кампаніі — ужо дасягненне.

Асноўнай рысай сёлетніх беларускіх мясцовых выбараў па ўсёй верагоднасці стане іх нецікавасць, перш за ўсё для многіх патэнцыйных шукальнікаў палітычнага поспеху. Добра вядома, што мясцовыя органы ўлады ў краіне носяць большай часткай намінальны характар. Гэта значыць, што яны нібыта ёсць, але нічым сур'ёзным і лёсавызначальным не валодаюць. Асноўная функцыя саветаў дэпутатаў у гарадах, раёнах і абласцях — гэта зацвярджэнне бюджэту адпаведнай адміністрацыйнай адзінкі, праект якога прапануе мясцовая прэзідэнцкая вертыкаль. Зразумела, той ці іншы савет можа ўвесці якія-небудзь дадатковыя мясцовыя падаткі, разгледзець стан спраў па тым ці іншым аспекце жыцця, але не больш таго. Неяк сур'ёзна ўплываць на рэчаіснасць у сваім горадзе, раёне ці вобласці ён магчымасці не мае — уся рэальная ўлада і рычагі ўздзеяння знаходзяцца ў руках адпаведных выканаўчых камітэтаў, гэта значыць, прэзідэнцкай вертыкалі.

З таго вынікае, што быць так званым „вясельным генералам" жадаючых знаходзіцца няшмат. Па звестках Цэнтральнай выбарчай камісіі на 24 012 усіх дэпутацкіх мандатаў прэтэндуе толькі 25 805 кандыдатаў. То бок, сярэдняя колькасць прэтэндэнтаў на месца — 1,1. Нават у не надта прэстыжныя навучальныя ўстановы такі конкурс за конкурс і не лічыцца.

Канешне, мясцовасць мясцовасці розніца — на вёсцы людзі, нібыта, непалітызаваныя, як паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. Таму там выбары практычна безальтэрнатыўныя, чаго нельга казаць аб сталіцы і буйных гарадах. Праўда пасля такога тлумачэння ўзнікае пытанне, а што вяскоўцам усё роўна хто імі будзе кіраваць? І, здаецца, што сапраўды ўсё роўна, бо людзі выдатна разумеюць дэпутацкія магчымасці верагодных абраннікаў.

Крыху іншая сітуацыя ў буйных населеных пунктах. Тут, зразумела, дае аб сабе знаць апазіцыя, якая імкнецца выкарыстаць выбары, у першую чаргу, для папулярызацыі ўласных ідэй, а ўсё астатняе — як атрымаецца. Чыста алімпійскі прынцып — галоўнае не перамога, а ўдзел. Магчыма, на даным этапе грамадска-палітычнага развіцця Беларусі гэта дасць некаторы плён, бо ўжо многія ў краіне забыліся, што можа існаваць і адрозная ад прэзідэнцкай думка, якая да таго яшчэ можа быць і слушнай.

Але не ўсё так проста. Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, у якіх практычна няма прадстаўнікоў гэтай самай апазіцыі, без асаблівых цяжкасцей знаходзілі розных кшталту хібы ў антыпрэзідэнцкіх вылучэнцаў. Гэта і не правільна запоўненыя паперы, „несумленна" сабраныя подпісы і ў дадатак да ўсяго — нібыта, не адпаведныя рэчаіснасці даныя ў дэкларацыях аб даходах. Дарэчы, гэтыя дэкларацыі — новаўвядзенне Цэнтрвыбаркама, бо ў папярэдніх выбарах мясцовага ўзроўню іх не было. Папраўдзе, тады і не было асаблівай патрэбы, бо выбары 1999 года апазіцыя байкатавала, а выбары 1995 года праходзілі ў больш-менш дэмакратычнай атмасферы.

Такім чынам, „неадпаведных" сучасным выбарчым патрабаванням патэнцыйных кандыдатаў набралося аж 3% ад агульнай колькасці заяўляльнікаў, а дакладней 762 прэтэндэнты. Амаль палову з іх складаюць вылучэнцы ад апазіцыйных дэмакратычных партый, лідэры якіх ужо кажуць аб выкарыстанні цяперашняй уладай адміністрацыйнага рэсурса і не выключаюць магчымага зняцця камісіямі з выбарчага марафону ўжо зарэгістраваных кандыдатаў-апазіцыянераў.

Здаецца, сёлетнія выбары ў Беларусі гэта свайго роду бег на месцы як для прэзідэнцкай улады, так і для апазіцыі. „Вертыкальшчыкам" хочацца толькі паказаць нейкую наяўнасць дэмакратыі, але робяць яны гэта не надта ўдала, бо нават дагэтуль (на момант напісання артыкула) не запрасілі на выбары назіральнікаў АБСЕ. А дэмакратычная апазіцыя ўсё яшчэ рыхтуецца да перамог, што прыйдуць праз гады. У выніку ўсё застаецца на сваіх месцах.

Уладзімір Лапцэвіч

Спрыяльная атмасфера для роднай мовы

[1 ☞ працяг]

кончыліся мастацкімі выступленнямі. У арганізацыі школьных мерапрыемстваў дапамагае вучнёўскі самаўрад, якім апякуецца Галіна Скепка. Некаторыя ініцыятывы выходзяць ад вучняў і яны самі іх рэалізуюць. Моладзь ладзіла пешаходны рэйд у наваколле Шастакова. Па дарозе вучні выконвалі задачы, а на месцы адпачынку арганізаваны былі спартыўныя спаборніцтвы і гульні. Вучнёўскі самаўрад праводзіў конкурсы на найлепшага настаўніка школы, найцікавейшы ўрок і арганізаваў у школе пошту для вучняў. З'яўляецца ён суарганізатарам ёлкі і школьных атрасінаў.

— Калі ў самаўрадзе ўзнікаюць ідэі пазакласнай дзейнасці або арганізавання мерапрыемстваў, то кансультуем іх з дырэктарам школы. Важна, каб мерапрыемствы не перашкаджалі ў вучобе, — заяўляе Эвеліна Пліс, якая два апошнія гады была старшынёй вучнёўскага самаўрада, а зараз з'яўляецца яго сакратаром. Добра развіваецца супрацоўніцтва школы з Гмінным асяродкам культуры ў Чыжах і яго кіраўніком Юрыем Якімюком, які дапамагае ў правядзенні некаторых урачыстасцей. Цікавіцца школьнымі справамі і прымае ўдзел у мерапрыемствах войт Юрый Васілюк.

Вучацца беларускай мове

Навучанне беларускай мове вядзецца з першага класа і амаль усе вучні ходзяць на гэтыя заняткі.

— У нашай школе спрыяльная атмасфера для навучання беларускай мовы. На сустрэчах з бацькамі класныя выхавацелі заахвочваюць, каб тыя пасылалі дзяцей на ўрокі беларускай мовы. Дзеткі прыходзяць на ўрокі ахвотна. Спачатку гуляем з вучнямі, гаворым скорагаворкі, вершыкі, спяваем песні і многа рысуем. Пасля вучні знаёмяцца з літарамі і пачынаюць чытаць, — інфармуе настаўніца беларускай мовы Валянціна Андрасюк, якая вядзе заняткі з малодшымі вучнямі. — Гаворым на ўроках аб беларускіх традыцыях і арганізуем конкурсы.

Школа забяспечана падручнікамі па беларускай мове, касетамі і фільмамі. Дзеткі любяць рыхтавацца да дэкламатарскіх конкурсаў. Першыя месцы ў раённым аглядзе Дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова" занялі Эвеліна Артэмюк і Патрык Шацілоўскі, а вылучэнне атрымала Данеля Філіманюк. Малодшыя вучні наведалі Беларускі музей у Гайнаўцы, а старэйшая моладзь ездзіла ў музеі ў Студзіводах і Будах.

— Стараемся заахвочваць да вучобы беларускай мове арганізуючы заняткі з выкарыстаннем камп'ютэраў, гульняў у класе і на школьнай пляцоўцы. У старэйшых класах вучоба беларускай мове больш інтэнсіўная, бо многія нашы вучні ідуць пасля вучыцца ў беларускія ліцэі, — кажа Анна Лаеўская, якая вучыць беларускай мове ў старэйшых класах Падставовай школы і, разам з Верай Акачук, у Гімназіі.

Вучні з Чыжоўскай школы пісалі артыкулы ў „Зорку" і прымалі ўдзел у яе „Сустрэчах". У аглядах тэатральных калектываў, арганізаваных у Кляшчэлях, занялі першае і другое месца.

Аляксей Мароз

Упаўнаважаны, не заступнік

[1 ☞ працяг]

столькі ў такой сітуацыі змагу. Нічога я не ў змозе ім загадаць.

— А як Вы ўяўляеце супрацоўніцтва з беларускім асяроддзем, падзеленым у розных адносінах?

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

— Мая функцыя — непалітычная. Напэўна не буду ўцягвацца ў любыя спрэчкі паміж паасобнымі беларускімі асяроддзямі. Буду размаўляць з усімі, вядома, калі і ў другога боку будзе такая ахвота. У Падляшскім ваяводстве на гэты момант зарэгістравана 25 згуртаванняў нацыянальных меншасцей. Усе яны будуць трактавацца мною аднолькава. Няма лепшых, горшых, няма такіх, якія выказваюць адзінаслушныя патрабаванні ці пастулаты.

— Якія, на Вашу думку, ёсць у беларусаў праблемы, з якімі прыйдзецца Вам змагацца?

— Абыходзячы гэтыя падзелы, якія найчасцей выступаюць на палітычным грунце (а я, як ужо казаў, у палітыку не буду ангажавацца), дык ведаю, для прыкладу, што ад гадоў такой праблемай для беларускага асяроддзя ёсць пабудова музея ў Гайнаўцы. Не абяцаю, што адразу ўключуся ў гэту справу, бо гэта перш за ўсё праблема беларускага асяроддзя. Падобная праблема была ў літоўцаў. Заснавалі яны спецыяльны камітэт, фонд. Ужо не дзейнічае, бо пабудова дому літоўскай культуры ўжо завершана і аснова функцыянавання таго згуртавання страціла сэнс. У выпадку гайнаўскага музея, калі буду ведаць пра нейкія магчымасці, крыніцы фінансавання, то, несумненна, камітэту пабудовы музея падкіну гэтыя інфармацыі. Ды нельга разлічваць на тое, што прынясу мяшок грошай. Ані іх у мяне няма, ані няма іх у падляшскага ваяводы.

— Установа ваяводы мае, аднак, уплыў на магчымасць здабыць грошы з цэнтральнага бюджэту, для прыкладу, на мэтавыя датацыі. Ці Вы мелі б магчымасць, праз ваяводу, старацца за такія сродкі з гэтай крыніцы на чаканы Цэнтр беларускай культуры, які, згодна з намерамі, меў бы ўзнікнуць у Беластоку?

— Такога тыпу дзеянні буду рэкамендаваць ваяводу і буду сам іх падтрымліваць. Дэкларую гэта. Калі будзе такая ці падобная патрэба, то ваявода, несумненна, падпішацца пад такой прапановай.

— А ці маглі б Вы быць пасрэднікам у дапамозе пры ўзнаўленні дзейнасці Радыё „Рацыя"?

— Радыё „Рацыя" было прыватнай радыёстанцыяй і павінна на такім рынку функцыянаваць і спрабаваць знайсці спонсараў.

— Ды Радыё „Рацыя" выпаўняла некамерцыйныя функцыі, а шырока разуметыя грамадска-культурныя, да таго не толькі ў Польшчы, але і ў гэтай частцы Еўропы. Значыць, некаторыя яго заданні супадаюць з інтарэсамі польскай адміністрацыі.

— Справа ў тым, што да гэтай пары, незалежна ад шматлікіх стараняў, няма закону які рэгуляваў бы статус нацыянальных меншасцей у Польшчы. Усё яго мяняюць, усё паяўляюцца на яго новыя ідэі. Значыць, няма праўнага акта, які рэгуляваў бы і пытанні такога тыпу. У гэты момант Радыё „Рацыя" трактуецца як любая іншая прыватная радыёстанцыя, і сама мусіць старацца здабыць сродкі на сваё існаванне. Мушу, аднак, праверыць, бо, можа, ёсць нейкая магчымасць, каб застукаць, напрыклад, да Міністэрства культуры па якуюсь датацыю на гэту мэту, беручы пад увагу, якую ролю гэтае радыё выпаўняе. Варта тут дадаць, што ўзнаўленне дзейнасці Радыё „Рацыя" набрала б вельмі важнага палітычнага розгаласу. Фармаванне профілю і магчымасці вяшчання, значыць, не ляжала б у магчымасці рэгіянальных улад, а вышэй, хоць бы Міністэрства замежных спраў, бо гэта пытанне замежнай палітыкі, завялікай, як на мясцовую ўладу, паколькі паяўляюцца тут міжнародныя паслядоўнасці.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Марэк Лібэрадзкі — другі ўпаўнаважаны ваяводы па справах нацыянальных меншасцей. У 1996 г., у час улады ваяводы Анджэя Гаеўскага (СЛД) стаў ім на кароткі час краязнаўца Славамір Галіцкі. Не здабыў ён на гэтым полі, аднак, шматлікіх поспехаў, даходзіла да непаразуменняў. За ваяводжання Крыстыны Лукашук (АВС) такое пасады ў Ваяводскай управе не было, паколькі ваявода, як сама казала, не бачыла такое патрэбы. Марэк Лібэрадзкі да назначэння ўпаўнаважаным ваяводы па справах нацыянальных меншасцей быў блізкім супрацоўнікам сённяшняга ваяводы Марка Стшалінскага (СЛД). Раней працаваў у беластоцкім аддзеле TVP, дзе м.інш. рэдагаваў тэлеперадачы меншасцей і матарызацыйную. Да тае пары быў шматгадовым працаўніком (журналістам і выдаўцом інфармацыйных праграм) Радыё Беласток.

У дзень, у якім аддавалі мы гэты нумар „Нівы" ў друк, адбылася першая ў гэтай кадэнцыі сустрэча ўрадавых і самаўрадавых улад з прадстаўнікамі згуртаванняў і арганізацый Падляшскага ваяводства. Былі на яе запрошаны: самаўрадавыя і ўрадавыя ўлады Падляшскага ваяводства, старшыня сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей Генавефа Вісьнёўская, віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі Зянон Косіняк-Камыш. Згодна з планамі, мела быць гэта сустрэча прысвечаная абмену г.зв. узаемнымі чаканнямі. Як сцвердзіў Марэк Лібэрадзкі — адкрытая дыскусія аб усім.

Словы спачування **МІРАСЛАВУ ПЯКАРСКАМУ** і яго сям'і з прычыны напаткаўшага іх гора — **смерці МАЦІ** — выказваюць сябры.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Да пашырэння запаведніка пераконвала Аліцыя Брэймеер (другая справа). Побач яе бурмістр Анатоль Ахрыцюк, які вёў пасяджэнне.

Пашырыць не рашыліся

У ходзе сустрэчы, якую ў Гайнаўскім магістраце 3 лютага арганізаваў Польскі навуковы камітэт ЮНЕСКА-МАБ, ідэю пашырэння Біясфернага запаведніка на ўсю польскую тэрыторыю Белавежскай пушчы падтрымалі прадстаўнікі Міністэрства асяроддзя, Генеральнай дырэкцыі Дзяржаўных лясоў, Белавежскага нацыянальнага парку і ваяводскіх улад. Згоды не далі самаўрадаўцы, якія запрашалі прадстаўнікоў ЮНЕСКА на сесіі гмінных рад з мэтай пераканаць радных да ідэі пашырэння тэрыторыі Біясфернага запаведніка.

— Штораз больш гаворыцца, што будзе асаблівы падыход да ўсходняй часткі гэтага рэгіёна ў сувязі з уступленнем Польшчы ў Еўрасаюз. Пабольшанне тэрыторыі Біясфернага запаведніка на ўсю пушчу не выклікае ніякіх абмежаванняў. Застануцца тыя ж самыя, што існуюць зараз. Стварэнне вялікага запаведніка з'яўляецца павышэннем рангу прыродазнаўчых і культурных каштоўнасцей рэгіёна і дае магчымасць прапагандавання іх на ўвесь свет. Гэта свайго роду знак якасці, які можна выкарыстаць для развіцця рэгіёна, — пераконвала Аліцыя Брэймеер, старшыня Польскага навуковага камітэта ЮНЕСКА-МАБ.

Войты Дубіцкай гміны Анатоль Паўлоўскі і Нарваўскай Якуб Садоўскі пыталі, якія канкрэтныя карысці будуць для жыхароў прыпушчанскіх мясцовасцей і самаўрадаў.

— Гэта будзе залежаць ад таго, як зможаце выкарыстаць знак Біясфернага запаведніка, намагаючыся атрымаць вонкавыя сродкі. Напэўна не атрымаеце непасрэдных сродкаў з ЮНЕСКА, — сказала Аліцыя Брэймеер.

Ідэю стварэння запаведніка на тэрыторыі ўсёй пушчы падтрымала дэкан Замясцовага аддзялення ўпраўлення асяроддзем Беластоцкага політэхнічнага інстытута ў Гайнаўцы Альжбета Мальцан. Паводле яе, запаведнік спрычыніцца да развіцця кантактаў мясцовых студэнтаў з калегамі з заходніх вышэйшых навучальных устаноў. Прафесар Януш Фалінскі, звязаны з Белавежскім паркам, звяртаў увагу на значэнне запаведніка для захавання рэдкіх відаў расліннасці і прапанаваў больш грунтоўна інфармаваць мясцовае насельніцтва аб запаведніцкай ідэі.

— Стварэнне запаведніка можна прыраўняць да атрымання шляхецкага звання. З такім званнем можна нечага дабіцца, — гаварыў прадстаўнік ваяводы, ваяводскі рэстаўратар прыроды Рамуальд Люта. Падрыхтаваныя ўжо карты і вопісы Краявіднага запаведніка Белавежскай пушчы і Рамуальд Люта прапанаваў пашырыць Біясферны запаведнік да тэрыторыі Краявіднага запаведніка. Прадстаўнікі Дзяржаўных лясоў таксама заахвочвалі самаўрадаўцаў да запаведніка, звяртаючы ўвагу на прэстыж з ім звязаны. Аднак, войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч паінфармавала, што Рада Гайнаўскай гміны адмоўна ацаніла прапанову пашырэння запаведніка. Прапанавала яна, каб Владзімеж Квяткоўскі з Політэхнічнага інстытута ў Беластоку, які кіраваў падрыхтоўкай праекта пашырэння запаведніка, прыехаў на сесію Рады Гайнаўскай гміны і паспрабаваў пераканаць радных адмяніць пастанову.

Бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк звяртаў увагу, што зараз няма вонкавай падтрымкі для рэалізацыі экалагічных інвестыцый. Гаварыў ён, што ў Міністэрстве асяроддзя не цікавяцца прыпушчанскімі самаўрадамі, а апошнім часам не адпісалі на карэспандэнцыю з Гайнаўкі. Прысутная на сустрэчы Дарота Радзівіл з Дэпартамента аховы прыроды Міністэрства асяроддзя абяцала высветліць справу карэспандэнцыі з Гайнаўкі і даслаць Саюзу гмін Белавежскай пушчы інфармацыю аб біясферных запаведніках. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк, які вёў спатканне, запрапанаваў адтэрмінаваць да канца лютага рашэнне наконт пашырэння тэрыторыі Біясфернага запаведніка. Да гэтага часу будуць праведзены кансультацыі з раднымі прыпушчанскіх гмін, якія будуць вырашаць справы запаведніка.

Аляксей МАРОЗ

Запрашэнне

Сергіевіч у Беластоку

24 лютага 2003 г. (панядзелак) а гадз. 18 у Музеі Альфонса Карнага ў Беластоку, вул. Святаянская, 17 адкрыецца выстава карцін Пётры Сергіевіча, якія знаходзяцца ў прыватных калекцыях у Польшчы.

Арганізатары запрашаюць прыхільнікаў таленту мастака на вернісаж і перапрашаюць за памылковую дату пададзеную ў „Часопісе".

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Вачыма паляка

Можа... не над *morze?*

Беласток у апошні час стаў гаспадаром сустрэчы членаў Выканаўчага камітэта Камісіі краін Балтыйскага мора, якая дзейнічае ў рамках міжнароднай Канферэнцыі перыферыйных надморскіх рэгіёнаў Еўропы (32 еўрапейскія рэгіёны). У гатэлі „Крышталь" галоўным чынам аб тэхнічных праблемах звязаных з дзейнасцю Камісіі дыскутавалі яе прадстаўнікі, між іншым, са Швецыі, Фінляндыі, Даніі і Латвіі. Папярэднія правыя самаўрадавыя ўлады Падляшскага ваяводства ўключыліся былі ў Канферэнцыю, па ініцыятыве былога падляшскага віцэ-маршалка Аляксандра Усакевіча. Такім чынам наш рэгіён стаў адзіным у Польшчы ваяводствам, якое належыць да CPMR (абрэвіятура англійскай назвы). Сённяшняя левая ўправа і радныя Сеймікa не вельмі ведаюць, што з гэтай прыналежнасцю далей рабіць. Невядома, якую карысць мела б яна прынесці ваяводству (датацыі на інвестыцыі, адкрыццё новых рынкаў экспарту?), прычым за ўдзел трэба плаціць 25 тысяч зл. складчыны з ваяводскага бюджэту. Да сёння таямніцай астаецца сам факт далучэння да гэтай Канферэнцыі, паколькі ніводнае польскае ваяводства не заявіла такое ахвоты, нават тыя, што мяжуюць з Балтыкай. Што далей з гэтым „баршчом" рабіць? На гэтае пытанне не можа адказаць ані актуальны маршалак Януш Кшыжэўскі, ні старшыня Сеймікa Збігнеў Кшывіцкі. Абодва яны яшчэ да пасяджэння ў Беластоку меркавалі: „Трэба прыгледзецца", значыць — пачакаем, пабачым. Тым часам, незалежна ад заявы, на сустрэчу не з'явіўся ваяводскі віцэ-маршалак Кшыштаф Талвінскі, а ўправа дэлегавала на абрады Яна Сычэўскага, члена ўправы па справах асветы і культуры і пару ніжэйшых чыноўнікаў па прамоцыі і супрацоўніцтве з замежжам.

Члены Выканаўчага камітэта Камісіі Балтыйскага мора размаўлялі перш за ўсё аб рашэннях, звязаных з далейшымі працамі паасобных тэматычных рабочых груп (напр. па справах транспарту ці трансгранічнага супрацоўніцтва). Незвычайную дыпламатыю, значыць, майстэрства ў пазбяганні якіх-небудзь адназначных выказванняў праявіў у пазнейшай размове з журналістамі старшыня Камісіі Андэрс Густаў (Швецыя). Таму зандзіраваць у гатэлі „Крышталь", якія карысці можам мець ад таго далучэння, не было магчымасці. У сапраўднасці адзіны канкрэт пачулі на жартаўлівае пытанне „Нівы" (пасля безвыніковага дамагання канкрэтаў), накіраванае да старшыні Густава, якой ікры ён аматар: астраханскай ці скандынаўскай. Адказ быў: шведскай, значыць, з рыб з тэрыторыі айчынных старшыні водаў.

Сур'ёзна, хоць не непасрэдна на тэму, падышоў да сустрэчы старшыня Кшывіцкі. Спрабаваў ён выкарыстаць сустрэчу блізка дваццаці прадстаўнікоў надбалтыйскіх рэгіёнаў да хаця б мінімальнай прамоцыі нашага ваяводства.

— Галоўная наша ідэя — ліквідацыя аграмаднай прорвы, паміж узроўнем развіцця ваяводства і іншымі рэгіёнамі краіны, не кажучы ўжо пра яшчэ большыя розніцы ў адносінах да рэгіёнаў краін Еўрасаюза, — тлумачыў З. Кшывіцкі. Аднак, не скрываў нязручнай сітуацыі, у якой апынуліся ваяводскія самаўрадавыя ўлады, атрымліваючы ў спадчыну прыналежнасць да CPMR.

— Вядома, мы іначай, чым яны, заўважаем прыярытэты развіцця ваяводства, па-іншаму расстаўляем акцэнты. Але выдатна разумеем, што сутнасцю ўсякага развою і ўсякага самаўпраўлення ёсць неперарыўнасць. Затым, наша сустрэча тут няхай таксама будзе доказам тае неперарыўнасці, паслядоўнасці.

Цікава, на якім, так сказаць, фронце дзейнасці падляшскіх улад тая неперарыўнасць мае быць, а дзе, у імя тае ж сутнасці ўсялякага развою — будзе парвана. Гэта пакажа, пэўна, практыка ў наступных месяцах і гадах гэтай кадэнцыі.

Вяртаемся да падляшскага ўдзелу ў Канферэнцыі. Няма ў мяне перакананння, а тым больш дастатковых ведаў, каб быць упэўненым наконт далейшага ўдзелу ў ёй нашага рэгіёна. Ведаю, усё ж, што ёсць цэлы шэраг арганізацый і канкрэтных праграм, непасрэдна звязаных са структурамі Еўрасаюза, за якімі мацуюцца залежы грошай на рэгіянальны развой. 25 тысяч зл. гадавой членскай складчыны на ўдзел у CPMR гэта, можа, не так і шмат. Але падобных сум, якія можна было б крышку прыашчадзіць у розных г. зв. галінах ваяводскага бюджэту, больш. Грош да граша, і не будуць гэта якіясь там тысячы, а найменш дзесяткі, сотні тысяч на, напрыклад, інвестыцыі, дзякуючы якім наш рэгіён зможа ўрэшце развівацца (вядома, пры паслядоўных пошуках іншых крыніц). Мяркуючы па некалькіх апошніх выказваннях маршалка Кшыжэўскага, управа збіраецца шукаць ашчаднасцей дзе толькі ўдасца. Пахвальна. А назіраючы выключна з журналісцкага пункту гледжання пасяджэнне Выканаўчага камітэта Камісіі краін Балтыйскага мора ў Беластоку, выхад з Канферэнцыі перыферыйных надморскіх рэгіёнаў Еўропы, у склад якое яна ўваходзіць, можа быць адным з першых (чарговых) эканомных рашэнняў управы і Сеймікa. А, можа, я памыляюся ў разліках?

Мацей Халадоўскі

Азіяцкі аспект

На старонках нашай „Нівы" ў апошні час ідзе гарачае змаганне за мір над райскімі рэкамі Тыграм і Еўфратам. Дазволю і я ўзяць у гэтай справе голас. Далучаюся я шчырым сэрцам да нашых галубіных аўтараў, да іх падтрымкі безабароннага Давіда перад абліччам узброенага ад галавы да пят жахлівага Галіяфа.

Уладзімір Сідарук („Праўда на баку пераможцаў", „Ніва" н-р 6) прыгадвае, што Еўропа ставіцца скептычна да акцыі супраць Ірака. 63 гады таму ў Мюнхене тая ж Еўропа таксама паказала сябе вялікім міратворцам у адносінах да такога ж дабрадзея, як сённяшні Гусейн. Ну а ўжо год пасля пачаўся, як вядома, такі мір, якога яшчэ свет не бачыў.

Яўгена Мірановіча („Планета малпаў", там жа) абурае агрэсія НАТА на Югаславію. Мяне таксама абурае тая агрэсія, бо ж, здаецца, пасля менавіта яе ўсё там і разгарэлася: пачалася бітва сербаў за Вукавар на харвацкай тэрыторыі, абстрэл сербамі „Алеі снайпераў" у Сараеве, узбраенне цяжкай артылерыяй патомкаў сербскіх гранічараў у Харватыі, бежанства ў чужыну косавараў і г.д. І невядома цяпер, як усю тую катавасію закончыць. Гэта, дарэчы, не першая вылазка амерыканскіх авіятараў: гэта ж яны звалілі колькі бомбаў на міралюбівыя Берлін, Рур, Гамбург ці Пенямюндэ каля шасцідзесяці гадоў назад; з гэтага ж, здаецца таксама, тады пачалася вайна.

Мікалай Панфілюк („Амерыка ў маіх вачах", „Ніва" н-р 5) займаецца бухгалтэрыяй: Савецкі Саюз у час апошняй вайны страціў каля трыццаці мільёнаў людзей, а ў Нью-Йорку раптам загінула каля трох тысяч чалавек — рыхтык як Дубіцкая гміна. Я таксама за тым, каб Амерыка раўняла да савецкіх перадавікоў. Ці ж не маглі б яны ў другую сусветную вайну ўзрываць мінныя загароды жывымі пехацінцамі, як гэта рабілі саветы, заміж разбураць іх артылерыйскім агнём? Або набудаваць недзе ў Алясцы лагераў і загаладзіць там тых некалькі дзесяткаў мільёнаў чалавек, у тым ліку і ўцекачоў з савецкага, як сам Панфілюк называе, раю? Або нават сёння збамбіць нейкі багаты нафтай Тэхас, як Масква Чачню? А ў мінулым: ці ж трэба было амерыканцам пастаўляць лэнд-ліз у трыдзевятае царства Савецкага Саюза — тады ж тых мільёнаў было б яшчэ больш, а і мы жылі б цяпер тут без тых усялякіх турбот з чыгункай, беспрацоўем ці змаганнем за пасаду войта ў Орлі. А найлепш было б, калі б нашы міралюбівыя, нават сёння, немцы запар з японцамі спляжылі тую Амерыку кідрэніфені — во было б тады мільёнаў!

Нашы аўтары, так як і за Гусейна, быццам ён з'яўляецца нейкім царкоўным мучанікам, вельмі хвалююцца запар і за праваслаўе. Вось нашы хлопцы ў Свіслачы, у даваенным маім Ваўкавыскім павеце, — у іх жа такавусенькае светаўспрыманне як у нас, — паставілі помнік Сталіну. Калі б Іосіф Джугашвілі не кінуў духоўнай семінарыі, тады быў бы звычайным бацюшкам, які б махаў крапілам, прычашчаў, вянчаў ці спавядаў, а на сваёй гаспадарцы трымаў бы казу, пару авечак і некалькі курачак з пеўнем. І мо паставілі б яму прыхаджане помнічак з крыжам на нейкім закаўказскім цвінтарыку. Але ён кінуў адукацыю і паслаў у рай некалькі дзесяткаў мільёнаў душ, у іх ліку тры з паловай мільёны ўсходнеўкраінскіх, безумоўна праваслаўных, сялян. Ну і ўзвялі яму нашы хлопцы помнік ад шчырага сэрца. Бо ж ён праваслаўны; як візантыйскі Васілій II, маскоўскі Іван IV ці нават вясковы Паўлік Марозаў.

* * *

Мы тут у нас абураемся на панішчаныя нейкімі вандаламі аўтобусныя прыпынкі, на графіці на чыстых сценах будынкаў, на авантуры футбольных балельшчыкаў з вырываннем і ламаннем крэслаў на стадыёнах. Гэтага не робяць статныя людзі, толькі тыя, якія з дзяцінства мутуюцца ў юнацтва. У больш багатых абставінах такія маладыя людзі здзяйсняюць большыя подзвігі, такія як рэвалюцыі ў Расіі ці ў Іране, разбураючы пры нагодзе ўсялякае матэрыяльнае і духовае дабро. А калі даць ім яшчэ нейкія агнястрэльныя цацкі, дык нават наводзяць карэктуры ў дэмаграфіі. Так было нядаўненька ў Югаславіі, так сёння адбываецца ў Палесціне. Піратэхніка тая не звальваецца ім як нябесная манна, атрымліваюць яе з вельмі канкрэтных крыніц, з падачы саноўных на від асобеняў, якія называюць сябе звычайнымі прэзідэнтамі.

Злучаныя Штаты Амерыкі заснавалі выхадцы з асветніцкай Еўропы не як нейкае царства, але як дзяржаву якая прадстаўляе інтарэсы яе грамадзян. І з таго часу не было там нейкай рэвалюцыі, якая б той парадак змяніла. У нашай ментальнай прасторы парадак зусім іншы. Наш менталітэт сфармаваны маскоўскай дзяржавай пасрэдніцтвам строга падпарадкаванай ёй Царквы і пасрэдніцтвам шматгадовай бальшавіцкай прапаганды. У нашай падсвядомасці засеяны імператыў, што ЗША з'яўляюцца монстрам, які толькі і цікуе каб нас закабаліць. І мы не бачым і нават не хочам бачыць таго, што ўлада за акіянам дбае пра сваіх грамадзян, не перашкаджае ім думаць і дзейнічаць дзеля свайго і грамадскага дабра.

Маскоўская дзяржава заснавана з ардынскай падачы на азіяцкім канфуцыянскім прынцыпе, што ўладар уладае, а падданыя яму падпарадкоўваюцца; гэта дзяржава ўлады. І нас не здзіўляюць подзвігі Івана Грознага, Іосіфа Сталіна ці Уладзіміра Пуціна, не здзіўляе і адсутнасць грамадскай там актыўнасці. Затое абураюць дзеянні амерыканскіх улад, якія рашуча намераны ліквідаваць крыніцы пагроз іхнім грамадзянам. У нашай штодзённай штодзённасці мы гэтага не заўважаем, бо галоўным нашым арыенцірам стаў тэлевізар. А ў ім поўна Амерыкі і яна нам надаела. І мы бунтуемся супраць яе машынальна, нават не задумоўваючыся над сэнсам таго бунту.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Прыклады саломапляцення: каравай, куфар. Аўтары: Наталля Карніевіч, Тацяна Русак

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Праф. Рыгор Шаур з гайнавянкамі Нінай Бурай (злева) і Марыяй Харкевіч

Надзеленыя залатымі рукамі

Гайнаўскі Беларускі музей наладзіў апошнім часам чарговае супрацоўніцтва. Гэтым разам яго партнёрам стаў Беларускі універсітэт культуры з Мінска. Падрыхтоўка да супрацоўніцтва і абмен карэспандэнцыяй не цягнуліся доўга. Выкладчыкі Кафедры народных рамёстваў БУК адгукнуліся адразу і запрапанавалі выстаўку „На скрыжаванні часу". Працуе яна ў Гайнаўцы ад 21 снежня мінулага года.

Спецыяльнасць народныя рамёствы ў Беларускім універсітэце культуры была адкрыта ў 1990 г., а ў 1993 г. пачала працу Кафедра народных рамёстваў, якой загадчыкам стаў прафесар Рыгор Фёдаравіч Шаур.

— Зараз на нашай кафедры працуе 15 штатных работнікаў, — сказаў нам праф. Шаур. — У іх ліку маецца адзін прафесар, тры дацэнты, тры старшыя выкладчыкі, два лабаранты, два майстры і адзін тэхнолаг. Асноўная колькасць педагогаў гэта члены Саюза мастакоў Беларусі. На кафедры працуюць вучэбныя майстэрні ганчарства і керамікі, ткацтва, габелена, бацікa, саломапляцення, малюнку, алейнага і акварэльнага жывапісу. Цяпер па спецыялізацыі навучаецца 169 студэнтаў на стацыянарным і 89 на завочным аддзяленнях. Кафедра дала чатыры выпускі спецыялістаў, якія працуюць на розных аб'ектах сферы культуры Беларусі. Дыпломныя работы студэнтаў вылучаюцца высокім мастацкім узроўнем, што пацвярджаюць мастацтвазнаўцы, крытыкі, выкладчыкі іншых мастацкіх устаноў.

Стаць студэнтам кафедры няпростая справа. Як патлумачыў праф. Шаур, прымаюцца выпускнікі мастацкіх школ ці вучылішч або прафесійна-тэхнічных вучылішч дэкаратыўна-прыкладнога накірунку. Абітурыенты немастацкіх школ проста не вытрымоўваюць канкурэнцыі на ўступных экзаменах, а і вучэбныя праграмы разлічаны на асоб, якія маюць асноўныя веды і навыкі ў выяўленчым мастацтве. Хаця БУК не рыхтуе жывапісцаў, графікаў ці скульптараў (гэтым займаюцца акадэміі мастацтваў), вялікую ўвагу адводзіцца малюнку, жывапісу, кампазіцыі, колеразнаўству. Такія прадметы фарміруюць у студэнтаў мастацкае мысленне, дапамагаюць выпрацаваць прафесіяналізм. На спецыяльных курсах і факультатыўных занятках студэнты займаюцца вышыўкай, вязаннем, камп'ютэрнай графікай. Апошняе дае магчымасць з дапамогай тэхнічных сродкаў мадэліраваць і канструяваць арнаментальна-кампазіцыйныя варыянты для ткацтва, вышыўкі, керамікі ці разьбы. Штогод студэнты ўдзельнічаюць у пленэрах, педагагічных і вытворчых практыках ды экспедыцыях. Улетку наведваюць яны Мір, Нясвіж, Навагрудак, Браслаўшчыну. Прырода, гістарычныя мясціны, сустрэчы з народнымі мастакамі ўзбагачаюць кругагляд студэнтаў, прывіваюць любоў да Бацькаўшчыны, да ўсяго таго, што створана беларускім народам.

Плён студэнцкай творчасці паказваецца на шматлікіх творчых і вучэбных выстаўках. Карыстаюцца яны поспехам у гледачоў, а гэта ў сваю чаргу стымулюе студэнтаў да новых пошукаў і далейшых творчых здзяйсненняў. Кожны год арганізуюцца персанальныя выставы таго ці іншага педагога. Не раз паказваліся акварэльныя работы У. Рынкевіча, жывапісныя творы У. Масленікава, габелены А. Салохінай, кераміка Т. Васюк. Студэнты часта наведваюць майстэрні вядомых мастакоў. Гэта для іх выдатная школа вучобы на сапраўдных узорах жывапісу, графікі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Значны ўклад у развіццё кафедры ўнеслі праф. М. Раманюк, д-р В. Ф. Шматаў, праф. Я. М. Сахута, мастацтвазнаўца В. А. Лабачэўская. Кафедра народных рамёстваў працуе на выхаванне і фарміраванне надзеленага залатымі рукамі і іскрай Божай спецыяліста, які будзе сеяць у народзе зерні прыгожага, добрага, светлага.

На дзень 30 студзеня, як паведаміла куратар выстаўкі „На скрыжаванні часу" Наталля Герасімюк, экспазіцыю ў Гайнаўскім беларускім музеі наведала 208 школьнікаў і 176 дарослых з Гайнаўкі, Беласточчыны і Беларусі.

Віктар Бура

У маршалка пра смецце

7 лютага ў сядзібе NOT праводзілася чарговая, з цыкла рэгіянальных, канферэнцыя, арганізаваныя пры супрацоўніцтве з Маршалкоўскай управай і пад ганаровым патранатам маршалка Падляшскага ваяводства.

У гэты раз тэмай канферэнцыі была „Гаспадарка адпадамі на тэрыторыі Падляшскага ваяводства". Адрасатам былі галоўным чынам прадстаўнікі гмін і паветаў ды прадпрымальнікі, якія займаюцца утылізацыяй смецця, навукоўцы. Былі прадстаўлены вынікі кантролю Ваяводскага інспектарата аховы асяроддзя ў гэтай галіне, працэсы і тэхналогіі тэрмічнай перапрацоўкі адпадаў ды абавязкі ў сферы звароту і перапрацоўкі адпадаў ад тары і выкарыстаных.

Шмат месца было адведзена планаванню ў галіне гаспадаркі адпадамі. Дырэктар дэпартамента экалагічнай палітыкі Міністэрства асяроддзя Марэк Сабецкі абмеркаваў абумоўленасці ў галіне планавання, напрамкі дзеянняў, якія вынікаюць з польскага заканадаўства і „Краёвага плана гаспадарання адпадамі" разам з дадаткамі прыняты ў кастрычніку мінулага года Радай Міністраў.

Спасылаючыся на гэты дакумент, да чэрвеня г. г. ваяводскія сеймікі маюць прыняць ваяводскія планы гаспадарання, а да канца чэрвеня 2004 г. гмінныя ўправы — гмінныя планы гаспадарння адпадамі. Тэрміны вельмі кароткі, а дакументы павінны быць паддадзены працэдуры кансультацыі і сугучаць з сабою.

З гэтай прычыны вельмі важны ёсць распачаты якраз пілатажны польска-галандскі праект пад назвай „Апрацаванне рэгіянальных планаў гаспадарання адпадамі і абучэнне лакальнай адміністрацыі ды развіццё грамадскай свядомасці", які абмеркавала Аліна Тугеман — дырэктар дэпартамемта Аховы асяроддзя і транспарту Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства. У гэтым праекце, апрача Падляшскага, прымае ўдзел Падкарпацкае ваяводства.

Дапамога галандцаў будзе датычыць перадачы вопыту ў галіне планавання, прагнозу ўздзеяння іх на асяроддзе, падыходу да сістэмы маніторынгу, заснавання „тылоў" падрыхтоўваючы асобы на розных ступенях самаўрадаў. Прадбачваюцца студыйныя паездкі ў Галандыю. Праект будзе працягвацца два гады.

Аліна Тугеман прадставіла поспехі ў працы над Ваяводскім планам гаспадарання адпадамі, звяртаючы асаблівую ўвагу на неабходнасць супрацоўніцтва і зносін усіх узроўняў самаўрадаў.

(лук)

Варта наведаць выстаўку

У Гайнаўцы ў апошні час арганізуецца многа мастацкіх выставак. Пры канцы мінулага года ў Гайнаўскім беларускім музеі была сарганізавана чарговая экспазіцыя. Пачынаючы з 21 снежня 2002 г. у выставачнай зале можна аглядаць працы студэнтаў Кафедры народных рамёстваў Беларускага універсітэта культуры з Мінска. Магчымасцю пабачыць экспанаты пакарысталіся мае сябры з II „а" класа беларускай гімназіі ў Гайнаўцы. На адным з урокаў беларускай мовы яны пазнаёміліся з мастацкімі вырабамі мінскіх студэнтаў. Увагу гімназістаў прыцягнулі, між іншым, іконы ў саламяных аздобных рамках, казачныя малюнкі з выкарыстаннем саломкі, а таксама ткацкае рукадзелле і гліняныя прадметы. Заахвочваю кожнага, хто яшчэ там не быў, наведаць залы Беларускага музея ў Гайнаўцы. Доказам, што варта наведаць выстаўку, хай будуць усмешкі на тварах гімназістак Ані Сянкевіч (з левага боку) і Ані Петручук.

Фота ІАЛАНТЫ ГРЫГАРУК

Фота ІАЛАНТЫ ГРЫГАРУК

Андрэй Грыгарук

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Чым славіцца Кітай?

Спытаў географ: — Мікалай,
Скажы, чым славіцца Кітай?
Вучань бянтэжыцца страшэнна,
З адказам на пытанне дрэнна.

— А можа скажаш, Мікалай,
Адкуль у хаце маем чай?
Адказ даў хлопец праз хвіліну:
— Купляем чай у магазінах.

Маем яшчэ і Адама?

Заглыбіўся муж зноўку ў газеце,
Як вярнуўся з работы дахаты.
Жонка скардзіцца: — Нашыя дзеці
Хуліганяць страшэнна, заўзята.

А найбольшае ў хаце скаранне
З тым Адамам, скажу табе прама.
Муж азваўся нарэшце з пытаннем:
— Дык мы маем яшчэ і Адама?

Белгімназісты з настаўніцамі Ірэнай Ігнатовіч і Галінай Іванюк з кветкавымі кампазіцыямі і пажаданнямі бабулям і дзядулям

Мы вас чакаем

Пра гэтае свята мы не маглі забыць. Для моладзі гайнаўскай белгімназіі жыхары Дома міласэрнасці „Самаранін" у Гайнаўцы — гэта іх бабулі і дзядулі. Яшчэ да свята, усімі сіламі рыхтавалі мы падарункі. Намерыліся зрабіць падарунак кожнаму, а гэта 56 чалавек. Дзякуючы прыхільнасці ўласнікаў кветкавых крамаў, якія зразумелі нас і далі кветак, мы зрабілі ўсім жыхарам дома кветкавыя кампазіцыі. Атрымалася цікава. Потым некаторыя не давалі павесіць іх на сцяне, хацелі патрымаць у руках, паглядзець і пацешыцца. Белгімназісты разам са сваімі настаўніцамі Ірэнай Ігнатовіч і Галінай Іванюк павіншавалі ўсіх са святам. Дайшлі да тых, якія не ўстаюць з пасцелі і да моцна хворых. У каго было больш сілы, мог прыйсці ў святліцу паслухаць артыстычную частку. Спадабаліся вершы. На тварах відаць было захапленне і радасць. Слёзы хвалявання і заклік: „Прыходзьце, прыходзьце, мы вас чакаем...". Стараемся прыходзіць — і то даволі часта. Былі там на Каляды. Мы віншавалі і калядавалі. Калядкі спявалі па-беларуску і па-польску, пры акампанемене акардэона, пад кіраўніцтвам настаўніцы Бажэны Ляўчук. Выявілася, што калядкі вядомыя ўсім. Жыхары дома „Самаранін" спявалі разам з моладдзю, спявалі таксама самі. Захапілі нас дасканалым веданнем тэкстаў і мелодый калядак.

Захапленне і радасць бабуляў і дзядуляў

Групы белгімназістак з 4-7 асоб прыходзяць сюды кожны тыдзень. Памагаюць прыбраць у пакоях, мыюць посуд, размаўляюць. У снежні, напрыклад, упрыгожвалі ёлкі. Жыхары Дома міласэрнасці вельмі ахвотна гутараць з моладдзю. Расказваюць як было ў час іх маладосці. Гавораць, што з кожным візітам уносім мы ў іх дом многа радасці, падбадзёрваем іх у далейшым жыцці. Бабулі і дзядулі чакаюць нас і прымаюць заўсёды вельмі сардэчна і цёпла. Можа і таму наша моладзь так ахвотна да іх ідзе.

Ірэна ІГНАТОВІЧ, настаўнік-бібліятэкар Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы

Дзённік Міколы

Замена

Яшчэ па дарозе з „Маліны" Аня запрасіла нас на свае дванаццатыя ўгодкі. Мерапрыемства мела адбыцца 12 мая, у той жа дзень, што і наш мастацкі конкурс.

— Аня, — сказала Марта, — чаму твой дзень нараджэння разам з конкурсам?

— Га, — усміхнулася Аня, — таму што гэта мы, а не хто іншы, пераможам у конкурсе. І будзе ў нас вялікая патрэба адпачынку і гульні.

— Ты думаеш, што мы выйграем гэты конкурс? — спытаў я.

— Натуральна, — адказала Аня.

* * *

Назаўтра я задумаў наведаць Нор Узі. Ужо спусціўся па лесвіцы, увайшоў у калідор, які вёў да кватэры мастака, калі спыніла мяне ўпартая Дамініка.

— Салют! — прывіталася яна. — У мяне інфармацыя для цябе.

— Інфармацыя?

— Так!

— Кажы хутка.

— Паслухай, Мікола, дырэктар школы сказаў, што Ярак не будзе прымаць удзелу ў спаборніцтве, якраз у той час ён разам з бацькамі паедзе ў Прагу.

— У якім спаборніцтве?

— Вядома, у конкурсе мастацтва.

— Што-о-о!.. — я усхваляваўся. — А хто яго заступіць?

— Я, — адказала Дамініка.

Я маўчаў, аднак пасля хвіліны прамовіў:

— Пайшлі да Нор Узі, хай ён прынамсі навучыць цябе, як трымаць у руцэ пэндзаль.

— Добра.

Мы пайшлі да мастака. Я пастукаў у дзверы. Пасля некалькіх хвілін дзверы адкрыла высокая спадарыня. Мы з Дамінікай чамусьці падумалі, што яна — чараўніца, і ўцяклі ў маленькі пакойчык, што знаходзіўся насупраць дзвярэй Нор Узі. Мы прасядзелі там дзве гадзіны, пакуль нехта з нашых сяброў не адчыніў дзвярэй. Гэта была Аня.

— Салют! — прывіталася яна. — Я бачу... вас нехта здорава напалохаў.

— Каб ты ведала, — пацвердзіла Дамініка.

— Ведаю-ведаю, — усміхнулася Аня. — Нор Узі ўсё мне сказаў.

Добра, што не хлус-кант, — падумаў я. (працяг будзе)

(нак-с)

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род

Кастусь Каліноўскі

Беларусь узнялася

Першыя паўстанцы з'явіліся на захадзе Беларусі ў студзені 1863 года. Вясною паўстанцкія аддзелы пачалі стварацца па ўсім краі. У іх уступала шляхта, чыноўнікі, студэнты і навучэнцы. Кожны пяты паўстанец быў селянін. На чале аддзелаў стаялі мужныя і адданыя справе вызвалення камандзіры Валер Урублеўскі, Рамуальд Траўгут, Людвік Звяждоўскі, Людвік Нарбут, Ігнат Будзіловіч, Фелікс Віславух...

Змагары атрымалі некалькі значных перамогаў. Яны авалодалі гарадам Горкі і мястэчкам Свіслач, напалі на Ружаны. У каліноўцаў не хапала зброі, вайсковага майстэрства, але іх вяла наперад вера ў справядлівасць. Сваіх баявых узнагародаў яны не мелі, і камандзіры пасля бою ўзнагароджвалі герояў проста кветкамі. Часта гэта былі белыя кветкі каліны.

Расійскім уладам удалося рознымі абяцанкамі падмануць значную частку беларускіх сялян. Шмат хто паверыў, нібыта „паны б'юцца з маскалямі, каб вярнуць адменены царом прыгон". Не было згоды і сярод кіраўнікоў паўстання. Некаторым не падабалася, што Каліноўскі і яго таварышы хочуць аддаць зямлю сялянам і зрабіць усіх людзей роўнымі перад законам. Усё гэта моцна аслабляла сілы змагароў.

На ўсходзе Беларусі карнікі задушылі паўстанне ўжо ў траўні. Былі разбіты і амаль усе нашы аддзелы ў Мінскай губерні. Толькі на Гродзеншчыне яны былі доўгі час недасягальныя для карнікаў, бо там паўстанцаў працягвалі падтрымліваць сяляне. Самы вялікі бой адбыўся каля вёскі Мілавіды, недалёка ад Слоніма. Нягледзячы на адвагу і гераізм, пад націскам выдатна вымуштраваных і ўзброеных расійскіх войскаў каліноўцы мусілі адступіць далей на захад.

На беларуска-польскім памежжы асобныя аддзелы вялі барацьбу да самага канца 1863 года.

(працяг будзе)

Польска-беларуская крыжаванка № 8

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 4: Яр, карп, снапок, пас, стол, піск, Ада, мастацтва, капотка, сойка, лік, воз, аркуш, Начча, кат. Ява, парасон, спіс, поза, настрой, ласка, ткач, кара, кос, актава, лук, ода, ціша, піла, сок.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Каміля Федарук** з Бельска-Падляшскага, **Юстына Асіпюк** з Нарвы, **Анна Раманаюк**, **Юстына Тэслюк** і **Паўліна Мароз** з Новага Корніна. Віншуем!

Самі пра сябе ☞

Мы вучымся ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. З'яўляемся вучнямі I „а" класа гімназіі. Нашай выхавацелькай — Яўгенія Врублеўская. У нас дваццаць дзве дзяўчыны і восем хлопцаў. Наш клас вельмі вясёлы. Часта ў класе жартуем і смяемся. На перапынках цікава праводзім час. Амаль усе любім танцаваць. Часам сустракаемся пасля заняткаў.

Многа асоб з класа наведвае дадатковыя заняткі. Мы спяваем у школьным музычным калектыве, іграем у баскетбол, працуем у школьным самакіраванні. Ходзім таксама на дадатковыя ўрокі.

На пачатку верасня выбралі мы сваіх класных прадстаўнікоў. Гаспадыняй стала я, Паўліна Ігнацюк, намеснікам — Мацей Васылюк, скарбнікам — Паўліна Паўлючук і Гжэгаж Плева.

На пачатку лістапада былі мы на экскурсіі ў Бельску-Падляшскім і Студзіводах. Глядзелі фільм „Помста" Аляксандра Фрэдры і былі ў музеі. Экскурсія вельмі нам спадабалася. Плануем паездку ў Варшаву.

Вучні I „а" кл. Гімназіі
ў Коплексе школ у Гайнаўцы

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дзеткі дэкламавалі вершыкі і спявалі песні

Дапамога наймалодшым

Гайнаўскія дзеці 25 студзеня прыйшлі з бацькамі ў Гайнаўскі дом культуры на ёлку арганізаваную Праваслаўным брацтвам св.св. Кірылы і Мяфодзія і Брацтвам праваслаўнай моладзі. Сустрэча пачалася малітвай і выступленнем а. Андрэя Буслоўскага — апекуна Брацтва праваслаўнай моладзі, які падзякаваў за дапамогу з гарадскога бюджэту (1 000 зл.), выкарыстаную на падарункі.

Перад дзяцьмі выступілі вучні Пачатковай школы н-р 5 са сцэнкай аб нараджэнні Хрыста. Сябры Брацтва праваслаўнай моладзі спявалі праваслаўныя калядкі, а хлопцы з Чаромхі — свецкія песні. Танцам спадарожнічалі гульні і конкурсы, у час якіх дзеткі спявалі песні і дэкламавалі вершы. Для сабраных падрыхтаваны быў пачастунак. Святы Мікалай раздаваў падарункі. На арганізацыю мерапрыемства былі выкарыстаны грошы, якія закалядавалі гайнаўскія братчыкі.

— У Гайнаўцы ёсць сем'і, якія патрэбна дапамога. Дзеці інтэгруюцца ў час мерапрыемства, могуць пазнаёміцца з вясковымі традыцыямі калядавання, — падкрэсліў старшыня Гайнаўскага аддзела Праваслаўнага брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія Ян Андраюк.

Аляксей МАРОЗ



Мал. МАРТЫ КАРЧЭЎСКАЙ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Славамір Кулік побач сваіх фатаграфій

Цэрквы, каплічкі, крыжы

У Малой галерэі Гайнаўскага белліцэя знаходзіцца выстаўка фатаграфій настаўніка Комплексу школ у Дубічах-Царкоўных Славаміра Куліка „Цэрквы, каплічкі, крыжы". На вялікіх здымках можна ўбачыць храмы са Старога Корніна, Пасынак, Чыжоў і гайнаўскі Свята-Троіцкі сабор. Побач іх вісяць прыгожа апраўленыя Віктарам Кабацам, які займаецца падрыхтоўкай выставак у белліцэі, фатаграфіі каплічак з Рыбалаў, Старога Корніна, Кленік, Гайнаўкі, Шчытоў і Тапіла. Славамір Кулік зрабіў многа фатаграфій драўляных прыдарожных і прыцаркоўных крыжоў. Цікавейшыя змясціў на выстаўцы так, каб крыжы разам з акружаючай прыродай састаўлялі цікавую кампазіцыю. Нестандартна сфатаграфаваны металічныя дэталі крыжоў з могілак у Істоку і Вярстоку і цікава паказаны стары крыж з могілак у Чыжыках. Зараз на могілках засталося толькі некалькі крыжоў і амаль не відаць магіл. Праз некалькі гадоў могуць зваліцца і гэтыя крыжы, якія, так як праваслаўная каплічка побач Гайнаўкі, з'яўляюцца часта фатаграфаваным аб'ектам. Многа крыжоў сфатаграфаваў аўтар каля Лядаў у Чыжоўскай гміне, дзе знаходзілася крыніца з цудадзейнай вадой.

— Па вёсках штораз часцей можна ўбачыць сцены старых дамоў прыкрытыя „сайдынгам", што беззваротна мяняе вясковы клімат. Трэба заклікаць людзей, каб захоўвалі вясковую архітэктуру ў традыцыйным стылі. Хачу сфатаграфаваць цікавейшыя месцы ва ўсім Гайнаўскім павеце — асабліва сакральную і драўляную архітэктуру. Трэба, каб засталося на здымках тое, што хутка можа знішчыцца, — лічыць Славамір Кулік. (ам-з)

У Мінску з'явіцца помнік Адаму Міцкевічу

Урад Беларусі прыняў пастанову аб узвядзенні ў Мінску ў 2003 годзе помніка Адаму Міцкевічу. Фінансаванне прац па праектаванні і будове помніка ўзяло на сябе Міністэрства культуры, а кошты ўстаноўкі скульптуры і добраўпарадкавання прылягаючай тэрыторыі — улады Мінска. Аўтарам праекта помніка з'яўляецца вядомы скульптар Аляксандр Фінскі. Паводле яго, адліўка помніка з бронзы павінна завершыцца да красавіка.

За апошнія дзесяць гадоў у Мінску з'явілася некалькі новых помнікаў дзеячам айчыннай культуры мінулага. Сярод іх асабліва належыць адзначыць помнікі Васілю Цяпінскаму, Міколу Гусоўскаму і Ефрасінні Полацкай у двары Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

„Советская Белоруссия", № 27 ад 12.02.2003 г.

Яшчэ аб Манюшцы

У рэпартажы „Страшны двор Станіслава Манюшкі" („Ніва" н-р 52 ад 29 снежня 2002 г.) Ганна Кандрацюк прадставіла актуальны і не надта цікавы стан матэрыяльнай спадчыны па стваральніку польскай нацыянальнай оперы Станіславе Манюшцы ва Убелі пад Мінскам і спецыфічнае стаўленне да гэтага месца прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі. Хаця ў мінулым годзе адзначаліся 130 угодкі смерці кампазітара, тамашні музей Манюшкі быў закрыты як для курортнікаў мясцовага санаторыя (яны нават нічога не ведалі пра музей), так і для беластоцкіх журналістаў.

Яшчэ да з'яўлення рэпартажа ў друку ў Музеі незалежнасці ў Варшаве прайшла двухдзённая папулярна-навуковая канферэнцыя пад загалоўкам „Манюшка якога не ведаем". У яе ходзе Анджэй Стуз — архівіст і бібліятэкар Варшаўскага музычнага таварыства імя Станіслава Манюшкі справу матэрыяльнай спадчыны кампазітара ў Беларусі прадставіў у зусім іншым святле. Паводле яго, музей Манюшкі ва Убелі добра сарганізаваны і даступны ўсім наведвальнікам.

Пасля азнаямлення з рэпартажам Ганны Кандрацюк правёў я размову са спадаром Стузам наконт разыходжанняў паміж вобразам, які ён прадставіў на канферэнцыі, а карцінай намаляванай ніўскай журналісткай. Аказалася, што мой суразмоўца на манюшкаўскай канферэнцыі прадставіў стан музея ў 80-х гадах мінулага стагоддзя, г.зн. за савецкім часам у Беларусі.

Цяперашняе незайздроснае становішча месца нараджэння кампазітара „Страшнага двара" гэта праява і вынік складаных польска-беларускіх адносін. Іх паляпшэнне магло б паспрыяць аднаўленню супольнымі намаганнямі дворыка сям'і Манюшкаў ва Убелі і добраўпарадкаванню навакольнай тэрыторыі. З такой прапановай польскі бок звяртаўся да беларускіх улад, але пакуль што безвынікова.

Міхал Занчэўскі

Плён VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Аляксей Дзядак

Жыццё

Жыццё, як гэта ўсё цікава,
І як гэта ўсё сумна.
Пражыў, але ці разумна?

А здаецца, жыццё — вечнасць.
А яно — недарэчнасць.
Недарэчнасць, калі без любові яно.
А яна ёсць, і мае сэнс зноў усё.

Руіна

Усё валіцца, ужо амаль руіна,
Але часам находзіць такая гадзіна,
Калі, здаецца, што ў парадку ўсё,
Але не, міраж прыходзіць, і зноў зло
Унутры паяўляецца. Канец, стоп!
Чалавеча, перастань, бачыш паварот?
Бачыш, вярніся адкуль ты прыйшоў,
Да таго моманту, калі ты знайшоў
Тое, што шукаў...

Агнешка Галімская

* * *

Прыпынілі чалавека з перавязанай рукой
святочныя мары.
Закрануў яго кусочак прыгожага,
Ап'янеў ад вострага паху ландыша,
Пабачыў скрозь свае пальцы
яе грудзі.
Разам напоўніліся цяплом...

Любоў?
А шчасце?

Прыпыніла чалавека з перавязанай рукой
рэчаіснасць.

Сільвія Дарашкевіч

* * *

... і без верша
магла б я ўсё высветліць і адысці.
Сёння ты далёка ад мяне,
за сінім акіянам.
А я ўсё думаю пра цябе
і твае празрыстыя вочы
бы вада нашага возера.
Набліжаюся да нашых мар,
незакончаных, простых
быццам вясковая дарога
і прыгожых як твой апошні сон.
Лепш адысці пакуль час
і адшукаць тое, што прапала...
... проста
хачу, каб у ноч разлукі
перамог сум, а не плач.
Гэту ноч правяду з табой,
хаця б у думках
і ніколі цябе не забуду,
ніякі акіян нас не раздзеліць.

Іаанна Гаўрылюк

* * *

прыходзім, праходзім, адыходзім
а шорах твайго ветру гоніць душу
па краях неба, зямлі і пекла
як спапялелы далакоп мараў маіх
запальваю свечку памяці ў душах
капля воску якой затапілася
каменем на дне рытмічнага болю
сэрца, атуманенага хвалямі тугі

у хвілінах слабасці
мне хочацца расчыніць руіны грудзей
пабіць цябе, знішчыць сябе
аднак яны праходзяць

Фільмавы вечар

Люты — час доўгіх зімніх вечароў. Каб не сядзець у хаце перад тэлевізарам, у якім паказваюць фільмы шматгадовай даўнасці, прапаную выбрацца ў кінатэатр. Прапаную два фільмы.

„Поліш кіч праект" (Polisz kicz projekt) у рэжысуры Марыюша Пуйшо, расказвае пра мужчыну, які пасля страты работы ў відэапракаце разам са сваім сябрам (рэцыдывістам Міхалам) рашаюцца ў просты спосаб зарабіць вялікія грошы. Вопыт з відэапракату прыдаецца, калі героі заяўляюць аб сваім удзеле ў конкурсе на незалежнае кіно. Марыюш прапануе эратычны фільм з прымессю жаху, камедыі, псіхалагічнай драмы (бо толькі гэта можа зацікавіць кінаманаў, з якімі меў справу на рабоце герой фільма). Хлопцы знаходзяць спосаб на сфінансаванне свайго праекта, арганізуючы агульнапольскі адбор кандыдатаў да роляў. Дзяўчатам за кастынг прыходзіцца заплаціць па 30 зл. (а кандыдаткам на галоўныя ролі яшчэ больш). Ахвотных зайграць у фільме не бракуе. А як атрымаўся кастынг — пабачце самі!

Другая прапанова — „Пакой сына"(La stanza del figlio) аўтарства Нані Марэці спадабаецца жанчынам. Цёплы, поўны драмы, псіхалагічны агляд жыцця з элементамі камедыі застанецца надоўга ў памяці гледачоў.

Гісторыя фільма ўзята проста з жыцця. Псіхолаг Джавані жыве спакойна, шчасліва, беспраблемна — прыгожая жонка, двое дзяцей, цікавая праца з моладдзю. Але шчасце не трывае вечна. Аднойчы ў дарожнай аварыі гіне сын Андрэ. Джавані траціць ахвоту да жыцця, сварыцца з жонкай, адсоўваецца ад дачкі, а калі даведваецца, што Андрэ меў дзяўчыну, галоўнай мэтай яго існавання з'яўляецца пошук сынавай сяброўкі. Ці гэта ўдасца? Ці пасля смерці каханага чалавека можна вярнуцца да жыцця? — адказ на гэтае пытанне дасць пабыўка ў кіно.

Паўліна Шафран

Папраўка

Ва ўспамінах „Тры гады прымусовай працы" Яна Панасюка з вёскі Чаромхі, запісаных У. Сідаруком у „Ніве" н-р 4 ад 26.01.2003 г. ёсць недакладнасць. Я. Панасюк гаворыць: „На прымусовыя работы ў Нямеччыну вывозілі ў 1942 годзе. Па спіску апынуўся я з аднагодкамі: Сцяпанам Леўчуком, Верай і Любай Внучкамі, Любай Міркоўскай, і Марфай Раманчук".

Хацеў бы ўдакладніць, што на прымусовыя работы ў Нямеччыну пачалі вывозіць ужо восенню 1941 г., а не ў 1942 г. Тады ўжо немцы вывезлі дзесяткі хлопцаў з вёскі Чаромхі, а Яна Панасюка і асобы, якія ён падае, вывезлі не ў 1942 г., а на пачатку лютага 1943 г., месяц раней чым мяне. То з гэтай групы нейкая дзяўчына падала нямецкім жандарам спісак хлопцаў і дзяўчын, якія могуць быць вывезены на прымусовую працу ў Нямеччыну. У тым спіску аказаўся і я. Аб гэтым данёс солтысу вёскі Чаромхі Якіму Шатыловічу бурмістр Кляшчэляў. Доказам на тое, што іх вывезлі на пачатку лютага 1943 г. (здаецца, у панядзелак 9 лютага) сведчыць першая прапіска — 20 лютага 1943 г. — у арбайтскарце Любы Міркоўскай. Памятаецца мне, што Ян Панасюк вярнуўся дамоў восенню 1945 г., дык нават, калі палічыць і пабыўку яго ў Савецкай Арміі, то тры гады ён не быў на чужыне. Я вярнуўся пазней за яго і мне да трох гадоў не хапала больш за месяц.

Дзмітры Шатыловіч

Сала і каўбаскі па-магілёўску

Раніца без кавы — як слава без грошай.

На шчасце, мы былі пры грашах і праз гадзіну, пасля начлегу ў Беразінскім лесе, сядзелі за сталом у рэстаране ў Бялынічах.

У традыцыі нашых вандровак ёсць знаёмства з кулінарыяй рэгіёна.

— Калі вы на Магілёўшчыне, вам трэба пакаштаваць „каўбаскі па-магілёўску", — прапанавала нам афіцыянтка. Рэстаран у Бялынічах ля рухлівай шашы Мінск — Магілёў, ён у вялікай меры падрыхтаваны для прыёму падарожнікаў. Эстэтыка рэстарана соцрэалістычная — уражвае прасторнасцю і штучным размахам. На сценах рэльефныя і керамічныя аздобы на савецкія матывы і капыл.

* * *

За сталом успамінаем кулінарныя прыгоды. На першым месцы — піццё кавы. Чатыры гады назад, мы гналіся сто кіламетраў спецыяльна, каб папіць кавы. У Ліду. На месцы, у аграмадным кафэ-рэстаране, у цэнтры стотысячнага горада, нам сказалі без цырымоніі:

— Кава? Была... але цяпер няма.

Іншы раз мы спецыяльна прыперліся ў Нарач, як не гаварыць, славутую турыстычную мясціну. Была поўня сэзона. У кафе-бары афіцыянтка сонным голасам прамовіла:

— Нічаво ні палучыцца, чайнік сламалса.

У Браславе, у сталовай, замест кавы падалі нам зялёна-вадзяны напар. Падалі яго ў збане, ужо пасалоджаны. Напар для пяці асоб падрыхтавалі з адной лыжачкі.

Дурны вопыт спароў нам фокус. Мы абедалі ў элегантным рэстаране ў Полацку.

— Калі ласка, згатуйце моцную каву, — папрасіла я афіцыянта, — з трох лыжачак.

Афіцыянт іранічна зірнуў у бок і працадзіў:

— Мы знаем как варить каву!

Зычайна, у кожную раніцу, самі гатавалі сабе пітво — каву, гарбату, суп „гарачы кубак". Заўсёды, у падарожжы з намі быў прыпас з Польшчы, пяць-дзесяць пачак кавы, гарбаты. Ёю абдароўвалі вяскоўцаў і знаёмых, якія частавалі нас яблыкамі і сліўкамі.

— Pamiętajcie, że i u nas jest takie miejsce, gdzie zawsze można się napić dobrej kawy, — павучаў нас ксёндз са Свіра, — to miejsce... to katolickie plebanie!

Навука ксяндза хутчэй за ўсё была Божым пажаданнем.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— Kochani, ja mogę was sałem i bulbą, a nie kawą poczęstować, — прывітаў нас ксёндз з Хотава, што ля Налібоцкай пушчы. Сам святар родам з падбельскіх Боцькаў, у Хотаве за дзесяць гадоў навучыўся мясцовых звычаяў.

— A jak ktoś z Polski tu pierwszy raz i mu się u nas nie podoba — to ja radzę — niech pocałuje najgrubszą dziewczynę jaką spotka. Wtedy i kawy się odechce.

* * *

Беларусы ядуць найбольш раніцай. У восем раніцы вам прапануюць вараную бульбу, катлеты, салаты, суп. Самы багаты і сытны наедак у пачатку дня.

На абед менш яды. У многіх хатах адграваюць усё тое, што асталося ад снедання. На стол ставяць адсмажаную або запечаную бульбу, бліны з мачанкай, аладкі, бульбяную бабку, адагрэты суп. Салаты і садавіну падаюць на пачатку і іх спажываюць перад галоўным блюдам.

Вячэра звычайна лёгкая, тут малочныя і бульбяныя прадукты, хлеб, садавіна. Беларускі спосаб харчавання здаровы і дапасаваны да натуральных патрэб арганізма. Раніцай прачынаешся бадзёры і галодны, як воўк.

У Бялынічах мы спаслаліся на густ сімпатычнай кіраўнічкі рэстарана. На пачатку мы спалучылі два сталы, каб пры сняданку весці бяседу. На галоўную страву трэба было пачакаць 30 хвілін. Перад тым мы з'елі яечню з дваццаці яек і папілі піўцом. Пасля нам падалі салат са свежых памідораў з цыбулькай, перчыкам і лістком пятрушкі. За тым, на стол паставілі духмяныя каўбаскі з варанай бульбай „пюрэ" і соленым агурцом. Назоў стравы „каўбаскі па-магілёўску" нясе ў сабе сюрпрыз. Каўбаскі маюць кшталт катлетак, яны з далікатнай шынкі, усярэдзіне нашпігаваныя часнаком, грыбамі і скрылёчкам сала. Яны сасмажаныя зверху на медзяны колер, у сярэдзіне сакавітыя і хрусткія.

Сняданак мы запівалі мінералкай, півам і кавай. За снеданне для васьмі асоб мы заплацілі шэсць долараў.

— Прыязджайце да нас часцей, — пачулі мы на развітанне ад гасціннай абслугі.

* * *

Нашы кулінарныя прыгоды мелі не толькі рэальны характар. У роднай вёсцы мастака Пётры Сергіевіча нас пачаставалі віртуальнай ухой. Да нашай кампаніі падсеўся падвыпіўшы дзядзька. Увесь вечар ён расказваў пра адно — пра рыбны суп з рыбы проста з возера Богінь.

— Дзяўчатам нада ўхі раніцай пакушаць, — паўтараў, як прыпеў у песні, мясцовы рыбак-аматар.

— А што ў ёй такога асаблівага? — распытвалі мы.

— Наша уха — то „о-го-го"! Як пад'ясі, то о-го-го будзеш...

Зашыфраваная рэклама нарабіла нам дзікага смаку. Наш знаёмы меў усю ноч — найперш лавіць, а пасля гатаваць „уху" для дзяўчат. Была поўня і смак той ухі мы спалучалі з рытуалам.

— Я вас нідзе не пушчу, — кляўся кухар, — вы адсюль не рушыце, пакуль маёй ухі не пакушаеце!

Канец быў такі — мы абышліся чыстым смакам. Раніцай нас паведамілі, што рыбак-кухар, разам з усходам сонца, з'ехаў у Паставы. Без развітання.

* * *

Пра сала беларусы расказваюць анекдоты, спяваюць песні.

Сама думка, што прыйдзецца частавацца ў гасцях салам, палохала. Гэты ласунак, здавалася, добры для дрывасекаў. А добры вандроўнік павінен шанаваць гаспадара і яго гасціну.

Для спажывання сала важная атмасфера. У Беларусі ўсе захваляюць сала. Яно ўжо там такое смачнае... Праўда, у агульнай кампаніі, сала смакуе лепш чым звычайна.

Раз, калі ў Шаркоўшчыне нас абдаравалі вялізным куском сала, мы кінуліся ў фантазію. Гітам сталі шашлыкі. На галінкі мы саджалі скрылёчкі сала, перапыканыя цыбулінай, перцам і зялёнымі памідорамі. Шашлыкі смажылі на вогнішчы падрыхтаваным з сырых галінак альшыны. Гатовы далікатэс мы елі з гарчыцай і таматным соусам. Смак паддаваў жытні хлеб, піва „Гедымін" і аповеды Вечаслава пра прыгоды на Гары Афон.

У канцы ўдзельнікі нашых вандровак ставаліся вялікімі аматарамі беларускага сала.

Ганна Кандрацюк

Выпрабаванне цудам

У першы дзень Успенскага посту, на свята, называнае мядовым Спасам, у Свята-Сімяонаўскім храме адкрыўся доступ да цудаў Гасподніх. У горад Брэст прыбыла ікона Збавіцела, якая ўжо праславілася па ўсёй вялікай Русі з'яўленнем на ёй кроватачэння. Побач яе для пакланення пакладзены яшчэ тры прывезеныя міратачывыя абразы: Хрыста-Збавіцеля, Божай Маці „Скорапаслушніца" і „Замілаванне". У першы дзень праваслаўны люд масава падаўся да святыняў. Чарга брэстаўчан, якія пажадалі пакланіцца цудоўным іконам, закруцілася ў двары і вылілася далёка за царкоўную агароджу. Гавораць, каб дайсці да аналоя, прыходзілася стаяць па пяць гадзін. І не толькі ў першы дзень.

Кроватачывасць іконы Збавіцеля аб'явілася ў доме простай сялянкі рабы Божай Антаніны ў вёсцы Дзяржавіна Арэнбургскай вобласці 5 красавіка 1998 г. Аднак гэтаму цуду папярэднічала іншае здарэнне. Спачатку, паводле расказаў матушкі Антаніны, пайшлі ўспышкі святла ад рук на іконе свяціцеля Мікалая. Пасля гэтага ў дом сталі прыязджаць паломнікі, часта бывалі святары. У час аднаго з малебнаў, калі айцы Уладзімір і Васілій заспявалі „Цару нябесны", з ручкі вісячага над іконай св. Мікалая абраза Збавіцеля сцяклі першыя кроплі крыві. Паступова кроватачэнне ўзмацнялася і стала выходзіць з ілба, ад калючак цярновага вянка іканапіснага Госпада. У цяперашні момант выява так заліта выдзяленнямі, што амаль не відаць твару.

Неўзабаве пасля з'яўлення цуду матушку Антаніну з кроватачывым абразам запрасіў да сябе патрыярх усяе Русі Алексій II. У Маскве намаганнямі сталічных вучоных быў праведзены аналіз саставу выцякаючых чырвоных струменьчыкаў. Заключэнне гаворыць, што вадкасць ідэнтычная чалавечай крыві IV групы — гэтай жа, што і на вядомай Турынскай плашчаніцы. Дарэчы, у ківот ікону „апранулі" ўжо для паездак. Да гэтага часу яе матэрыяльнае „цела" было звычайнай кардонкай. Выява зусім не старажытнага іканапісання. Ікону ўладальніца прыдбала ў дзень адкрыцця нанава пабудаванай Знаменскай царквы ў вёсцы Дзяржавіна.

Нягледзячы на пенсійны ўзрост, раба Божая Антаніна ўсюды суправаджае цудоўную ікону ў шматлікіх паездках. А за чатыры гады, па яе словах, ікона аб'ехала ўсю Расію. Перад візітам у Брэст кроватачывы абраз ужо другі раз пабываў у Мінскім Доме міласэрнасці. Там уладыка Сафроній выклапатаў, каб цудоўная працэсія направілася ў Брэст. З Мінска матушку Антаніну суправаджае раб Божы Іаан, якога дамашняя ікона „Замілаванне" пасля прабывання побач цудоўнага абраза таксама стала міраточыць.

Наша сустрэча з уладальніцай цудоўнай іконы адбылася ў епархіі. Рабе Божай Антаніне пад 60 гадоў, з выгляду яна тыповая простая руская бабулька. У яе трое сваіх дзяцей і двое прыёмных. Каб памагчы ім, пенсіянерка да гэтай пары працуе ў вёсцы пісьманосцам. Веруючай была заўсёды, як толькі помніць, пераняўшы праваслаўны строй душы ад сваіх бацькоў. У доме Антаніны міраточаць многія іконы. Мясцовыя святары памазваюць сабранымі ў начынні выдзяленнямі шматлікіх паломнікаў. Здзяйсняюцца аздараўленні. Паводле гаспадыні цудоўнага дома, духмянасць ад ікон настолькі моцная, што спаць прыходзіцца ёй на кухні. Аб сцякаючай з іконы Збавіцеля крыві маці Антаніна гаворыць коратка: „Гэта — агонь".

... І вось мы стаім перад зваліўшымся на нас цудам ва ўсёй аголенасці свайго нявер'я. „Як гэта — кроў? Адкуль? Што там, за ківотам?" Думкі роюцца, мітусяцца, спрачаюцца з душою, тузаючы сумленне. Цуда так вялікае, што цяжка поўнасцю паверыць. Якія ж мы бездапаможны ў сваім рацыяналізме! А сэрца вырываецца да святыні: прылажыцца, замерці, „заміраточыць" слёзамі...

Тамара Глушчанка

„Вечерний Брест", 16.08.2002 г.

Жаўруковы спеў Уладзіміра Мулявіна

Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая бывай.
Стаю на ростанях былых.
А з паднябесся самотным жаўранкам
Звініць і плача май.

З песні У. Мулявіна „Алеся"
на словы А. Куляшова

14 траўня мінулага года народны артыст Беларусі і СССР Уладзімір Мулявін, вяртаючыся са свайго лецішча ў Мінск, трапіў у аўтамабільную катастрофу. Ён не справіўся з кіраваннем і ў выніку „Мерседэс" вылецеў на абочыну, некалькі разоў перакуліўся і ўрэзаўся ў дрэва. Звычайна пры такіх здарэннях людзі гінуць. Але Мулявін выжыў. У той самы дзень яму ў сталічным навукова-даследчым інстытуце траўматалогіі і артапедыі зрабілі складаную аперацыю.

Вестка пра гэты выпадак, бадай, не абмінула ніводнай беларускай сям'і. Людзі спачувалі, перажывалі, маліліся за здароўе любімага артыста, сачылі за выпускамі тэле- і радыёнавін. Паведамленні абнадзейвалі.

Праз некалькі дзён Уладзіміра Георгіевіча перавялі ў Рэспубліканскую бальніцу Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Тут яму былі створаны спрыяльныя ўмовы для лячэння. Аднак пацярпелы і яго блізкія настойвалі на перавод у Маскву...

Адтуль даходзілі неблагія чуткі, што ў легенды беларускага фольк-рока справы ідуць на папраўку. Ён пачаў самастойна есці, а потым і выязджаць з бальніцы ў двор на інваліднай калясцы.

І раптам зранку ў нядзелю (26 студзеня) усіх ускалыхнула і ашаламіла трагічная вестка. Смерць, паводле афіцыйнага паведамлення, наступіла ў выніку сардэчна-сасудзістай недастатковасці.

Жонка Мулявіна, Святлана Пенкіна, пажадала, каб з артыстам развіталіся масквічы, што і адбылося ў канцэртнай зале „Расія".

Раніцай у аўторак труна з целам Мулявіна была дастаўлена на самалёце ў Мінск. Адпявалі яго ў галоўнай праваслаўнай святыні Беларусі — Свята-Духавым кафедральным саборы. Грамадзянская паніхіда адбывалася ў Цэнтральным Доме афіцэраў Беларусі (мо з улікам таго, што, якраз дзякуючы войску, Уладзімір Мулявін трапіў з далёкага уральскага Екацерынбурга (да нядаўняга часу Свярдлоўска) у нашу рэспубліку і спяваў у хоры Беларускай вайсковай акругі). А мо на выбар далейшага жыццёвага і творчага шляху паўплывала тое, што продкі Уладзіміра паходзілі з тутэйшага краю і на генную памяць шчымлівай ласкай леглі мілагучныя беларускія мелодыі...

Фактам з'яўляецца тое, што Мулявін назаўжды прыкіпеў душою да гэтай зямлі, гэтага народа і яго духоўных скарбаў.

Загадкай, як і ў выпадку з Максімам Багдановічам, з'яўляецца тое, што творца вырас у далечыні ад Беларусі, абвострана адчуў патрэбы развіцця нацыянальнага мастацтва, яго нерэалізаваныя магчымасці.

Дэмабілізаваўшыся з войска, Мулявін стварае ансамбль „Лявоны", аднак неўзабаве, нібы спахапіўшыся, пераназывае яго ў „Песняры". Напэўна, не выпадкова. Бо першая назва ўспрымалася занадта традыцыйнай, сялянскай, зарыентаванай на мінулае, тады як другая гучала больш вольна, расказвала і давала прастору для творчага пошуку, нават эксперыменту. Бо менавіта навізной у асэнсаванні традыцыйнага народнага меласу, нязвыкласцю выканальніцкага майстэрства і вызначыліся адразу „Лявоны"—„Песняры".

Нетрадыцыйна-сучасная манера спеву не была адназначна ўспрынята і ацэнена ў інтэлектуальных колах Беларусі. Атрымлівалася штосьці падобнае на гісторыю з Максімам Багдановічам. Як вядома, дасланыя ім у „Нашу Ніву" вершы не толькі не былі ўхвалены да друку, але і спісаны ў архіў, адкуль іх выцягнуў на свет белы і апублікаваў Вацлаў Ластоўскі.

У падобным стаўленні няма нічога дзіўнага: новае, наватарскае, нязвыклае

амаль заўсёды пракладвае сабе дарогу па цаліку, гэта значыць, праз пераадоленне перашкод. А ў мастацтве пераадолець супраціўленне можна толькі талентам, які даецца ад Бога. Цікава, што У. Мулявін не меў вышэйшай музычнай адукацыі, а ўсяго толькі вучобу з 1956 па 1958 год у Свярдлоўскім музычным вучылішчы, дзе, зразумела, нічога не было беларускага. У гэтай сувязі міжволі напрошваецца папрок у адрас тых артыстаў, якія ўсё жыццё пражылі на сваёй Бацькаўшчыне-Беларусі, большасць з іх нават пазаканчвалі тут спецыяльныя музычныя вучэльні, але застаюцца ў асяроддзі нацыянальнага мастацтва чужароднымі з'явамі, абыякавымі, а то і варожымі да мовы і культуры роднага народа. Дык як не згадаць па-народнаму трапныя і мудрыя словы з напісанай яшчэ ў першай палове XVII стагоддзя „Прамовы Мялешкі", дзе высмейваюцца вырачэнцы ўсяго роднага, у якіх свая костка „сабачым мясам абрасла"...

З 1962 года Уладзімір Мулявін працуе артыстам Беларускай дзяржаўнай філармоніі, а пасля, з 1969 года, мастацкім кіраўніком вакальна-інструментальнага ансамбля „Песняры". У яго творчай дзейнасці своеасаблівае выканальніцкае майстэрства арганічна спалучалася з глыбокім веданнем народнай песеннай творчасці, захаваннем і ўзбагачэннем на новым вітку развіцця яе лепшых традыцый. Гэта быў прарыў не толькі ў абсягах музычнай культуры, але і культуры ўвогуле, больш таго — у нацыянальнай свядомасці народа. Бо на сямідзесятыя гады якраз прыпадае пік дэбеларусізацыі, у выніку якога ў гарадах не застаецца ніводнай беларускай школы, на рускую мову пераводзяцца раней беларускамоўныя часопісы і газеты, і ўвогуле ўсё сваё, нацыянальнае зневажаецца і бэсціцца як адзнака замшэласці і прымітывізму. Гэта быў час, калі, кажучы словамі славутай паэмы „Сказ пра Лысую гару", „другі артыст народны не мог звязаць і двух народных слоў..." Мулявінскія „Песняры" адважна пайшлі насустрач гэтай ідэалагічна моцна забяспечанай праз дзяржаўную падтрымку хвалі нацыянальнага выраджэнства. І перамаглі! Безумоўна, музычна-спеўны гурт не мог істотна памяняць усю сітуацыю са станам беларускасці ў БССР, але ў абсягах сваіх магчымасцей яны зрабілі амаль неверагоднае. Беларуская мелодыя пачала заваёўваць самыя прэстыжныя сцэны, карыстацца велізарным попытам не толькі ў сябе на Радзіме, але і далёка за яе межамі. Такое трыумфальнае шэсце працягвалася не гады, а дзесяцігоддзі, аж да апошняга часу. Хоць пры гэтым былі і перыяды застою, і адхіленні ад сваёй вызначальнай, звязанай з адраджэннем нацыянальнага лініі, як, скажам, пры стварэнні вакальнага цыкла на словы Уладзіміра Маякоўскага, па-свойму паэта цікавага і значнага, але па духу, форме і стылю абсалютна далёкага ад творчай манеры і пафасу „Песняроў".

У 1979 годзе Мулявіну прысвойваецца званне „Народны артыст БССР", а ў наступным, 1980-м, урад суседняй Польшчы ганарує яго высокім тытулам заслужанага дзеяча культуры гэтай дзяржавы. Факт, лічу, вельмі паказальны, бо тое, што сцвярджаў на беларускай глебе мастацкі кіраўнік „Песняроў", было актуальным і для сумежнага славянскага народа, якому таксама дыхаў у спіну смуродлівы вецер хрушчоўска-суслаўска-брэжнеўскага „інтэрнацыяналізму", пры якім кожнаму народу з так званага „сацыялістычнага лагера" адмаўлялася ў праве ісці па дарозе ў будучыню сваёй дарогай, мець сваю непаўторную самабытную культуру.

Са створанага самім Мулявіным як кампазітарам ці праспяванага „Песнярамі" нагадаю некалькі твораў. З народнага рэпертуару гэта „Ой, рана на Івана", „Перапёлачка", „Касіў Ясь канюшыну", „А ў полі вярба", „Рэчанька", „Хлопец пашаньку пахае" і многія, многія іншыя. А з песень на вершы беларускіх паэтаў — найперш „Спадчына" на словы Янкі Купалы, „Мой родны кут" на словы Якуба Коласа, „Вераніка" на словы М. Багдановіча, „Александрына" на словы П. Броўкі, „Алеся" на словы А. Куляшова, „Белая Русь" на словы У. Скарынкіна і шмат, шмат іншых. У журботныя дні 27 і 28 студзеня Першы нацыянальны канал Беларускага радыё амаль без перастанку перадаваў песні і вакальныя цыклы ў выкананні „Песняроў", пры гэтым не паўтараючыся. Гэта і супакойвала, і лагодзіла душу адчуваннем велічы дасягнутага У. Мулявіным. Але неаднойчы пры гэтым абуджалася пачуццё скрухі: а дзе ж вы, даражэнькія, былі пры жыцці нашага вялікага Песняра, чаму так рэдка гучалі яго, як і іншых беларускіх кампазітараў і выканаўцаў, творы ў нашым нацыянальным паводле назвы, але запалоненым (гэта найперш датычыцца тэлебачання) эфіры, які даўно і трывала завалодала расійскамоўная безгалосая і бездухоўная папса, якая, зрэшты, не мае нічога з рускім па духу і стылю мастацтвам, якое, як і сапраўды значнае і самабытнае беларускае, даўно выціснута на абочыну жыцця.

Мулявін са сваімі „Песнярамі" аб'ездзіў уздоўж і ўпоперак усю планету, выступаў на самых прэстыжных пляцоўках, браў удзел у самых прэстыжных фестывалях і здабываў самыя прэстыжныя ўзнагароды. Пры гэтым ансамбль праявіў зайздросную, што не мае роўных, жыццястойкасць і доўгажыхарства. І зусім нездарма, мяркую, у гэтыя жалобныя дні яго ўклад у развіццё песеннай культуры неаднаразова параўноўваўся са зробленым і дасягнутым славутымі „Бітлзамі". То і варта, надоўга не адкладваючы, падумаць пра годнае ўшанаванне памяці яго стваральніка і нязменнага кіраўніка і натхняльніка Уладзіміра Мулявіна, як гэта ў дачыненні да сваіх славутых музыкаў-песняроў зроблена ў Англіі.

Мне пашанцавала быць у Ліверпулі і аглядаць той музей „Бітлзаў", збудованы на самым беразе, дзе ён займае вялікую плошчу, але не на паверхні, а пад зямлёю-морам. Уражанне ад убачанага і пачутага там — незвычайнае. Трапіць туды, асабліва для нашага чалавека, нялёгка і няпроста, бо ахвотнікаў значна больш, чым могуць умясціць памяшканні, а кошт білетаў досыць дарагі і для замежнікаў-капіталістаў. Такім чынам гэтая ўстанова не толькі прапагандуе сваё нацыянальнае мастацтва, але пры гэтым мае і неблагі прыбытак. Упэўнены: калі не адкладваць на потым, а ўжо цяпер аб'явіць конкурс на праект музея „Песняроў", а потым і пачаць будоўлю такога ж, як гэты ансамбль, арыгінальнага будынка, і стварыць у ім адпаведную ўкладу У. Мулявіна і яго калектыву экспазіцыю, то выдаткі абавязкова акупіліся б. Бо любоў беларусаў да „Песняроў" і іх мастацкага кіраўніка У. Мулявіна, мяркую, не меншая, чым у стрыманых на пачуцці англічан да сваіх славутасцей. Што гэта так, кожны мог пераканацца ў аўторак 28 студзеня, калі, не зважаючы на слотнае надвор'е, людзі выстройваліся ў даўжэзныя чэргі, хочучы развітацца з тым, каго так пры жыцці любілі. Такое, як расказваюць прадстаўнікі старэйшага пакалення, было толькі ў час развітання з Народным песняром Беларусі Якубам Коласам, калі людзей, як тады было прынята, не звозілі на машынах „на мерапрыемства" з прадпрыемстваў і ўстаноў, а яны самі, без усякай прынукі і прымусу, а паводле поклічу душы і сэрца ішлі, сцякаліся ручаінамі на цэнтральную плошчу сталіцы, у Дом прафсаюзаў, дзе беларусы аддавалі апошні паклон Песняру...

Цяпер зіма, але ў гэтыя журботныя студзеньскія дні за акном свяціла яркае сонейка, як прадвеснік вясны. Праз два месяцы прыляцяць з выраю птушкі, і не адзін жаўрук, узняўшыся ў высокае неба, захлынецца ў роспачным спеве ад страты, якая напаткала нас у гэтыя дні...

Яўген Лецка

Паважанне і „вышэйшая школа”

Калісьці, а мо нават і сёння, многія дзеці да сваіх бацькоў адносіліся з асаблівай павагай, бо да кожнага звярталіся на „вы”, а не на „ты”. Хаця я чамусьці ніколі да бацькоў не звяртаўся на „вы”, а толькі на „ты”, але бацькі на мяне за гэта не гневаліся.

Помню, як адзін дзядзька ў нас звяртаўся да сваёй маці на „вы”. Ягоная жонка памерла даволі молада і ён астаўся ўдаўцом. Жыў ён з маці і дзецьмі пакуль тыя не пажаніліся. Пасля дзеці адышлі з роднай хаты і ён астаўся жыць толькі з мацерай. Тады стаў ён часта заглядаць у кілішак і аднойчы маці, убачыўшы яго пад хмяльком, папракнула за п’янства. І тады той ветлівы сын стаў яе абзываць рознымі праклёнамі; адсутнічала ўжо слова „вы”, адно толькі раздавалася „ты” і „туды маць” і завяршыў сваю прамову чыста па-руску: Убью! Вось да чаго дайшла павага.

Калісь таксама бацюшка наш Іван Блізнюк са сваім сынам Ванькам (тым, што калісь у „Лявонісе” спяваў) чакалі на прыпынку аўтобуса; стаялі там і іншыя людзі. У той час шашою ехаў мой сваяк з Істока Іван і акурат, калі зраўняўся з прыпынкам, ягоны конь мо неяк не так ступіў нагою. І тады з вуснаў майго сваяка пасыпаліся такія „благаслаўленні” каню, што нават конскія вушы заварушыліся. А ён валіць на чым свет стаіць такія праклёны, што нават у „Кнігу Гінеса” можна занесці. І гэта перад самым носам бацюшкі; відаць яго не заўважыў, бо не дабачваў. Усе прысутныя на прыпынку сталі голасна смяяцца, а бацюшка з сынам амаль не лопнулі ад смеху. Бо бацюшка, хаця чалавек вучаны і саноўны, дык мо першы раз у жыцці чуў такое жывое беларускае выражэнне пачуццяў простага мужыка.

Аднойчы быў я са сваёй сумкай у Тафілаўцах і ў аднаго дзядзькі ўбачыў нашага Ванюшку, які ўжо жыў у Гайнаўцы. Гаспадары пачаставалі яго гарбатай, а мой зямляк што ні слова кідае „мясам”, хаця ж ужо гарадскі чалавек. І мацеры гаспадара, якая была жанчынай веруючай, абрыдла, відаць, слухаць такія салёныя апавяданні Ванюшкі, і сказала яна гарадскому госцю:

— О, ты, відаць, кончыў вялікую школу, калі гаворыш так, што не кожны і ўмее.

А Ванюшка мо і паверыў, што ён такі разумны, бо яшчэ больш шчыра стаў саліць свае расказы.

Сёння гэта мо ўжо і не навіна, бо нават дзяўчаты, вядома, не ўсе, авалодалі гэтым „майстэрствам”.

Мікалай Панфілюк

Вер – не вер

Дарагі Астроне! Прысніўся мне сон, які мяне крыху напужаў. Вось сніцца мне, што я паехаў у сваю родную вёску, дзе, праўда, нікога ўжо з маіх блізкіх родзічаў няма, але хатка, хоць і старая, яшчэ стаіць.

Выходжу я з хаты на парог, гляджу навокал. Раптам заўважаю, што на агародзе, які знаходзіцца за прыгуменнем, ідзе мая ўнучка са сваім бацькам. У агародзе ўсё зялёна і цвіце, вельмі там прыгожа. І раптам сярод гэтай прыгажосці здарылася нешта для мяне зусім незразумелае. Мой зяць, які ніколі не біў дачку, раптам размахнуўся нагой і з усёй сілы ўдарыў малую.

Я проста анямеў ад жалю і здзіўлення. А тут ужо бяжыць мая ўнучка і, уся ў слязах — плача аж заліваецца, скардзіцца на бацьку. Нікуды я больш з ім не паеду, кажа яна, нікуды.

Я прытуліў да сябе ўнучку, пачаў яе супакойваць. Кажу: бацька гэта зрабіў жартам, не ў злосці. І раптам бачу, што трымаю ў руках не ўнучку, а нейкага вялікага ката.

І ўжо я ў хаце. Мыю ў лазеньцы (якой ніколі ў нас не было) гэтага ката. Абмываю яго старанна ад бруду, намыльваю і палашчу вадой.

Астроне, як ты думаеш, ці гэты сон прадвяшчае кепскае (што ён нядобры — я ўпэўнены) мне ці маёй унучцы? Лепш няхай бы ён быў кепскі для мяне, абы ёй нічога не сталася. Яўген

Яўген! Я думаю, што твой сон абазначае наогул нейкія непаладкі ў тваёй сям’і, сямейныя непрыемнасці. Пра гэта, несумненна, сведчыць тое, што твой зяць біў сваё дзіця, тваю ўнучку. Але ж ёсць і пазітыўныя элементы, якія гавораць за тое, што скончыцца ўсё добра. Гэта перш за ўсё той зялёны, цвітучы агарод, які прадвяшчае здароўе і поспехі. Тыя сямейныя раздоры лагодзіць таксама плач тваёй унучкі.

Наогул мне здаецца, што непаладкі вынікнуць з прычыны фальшывых прыяцеляў сям’і ці сяброў унучкі. Аб гэтым сведчыць тое, што замест унучкі ты ў пэўным моманце трымаў ката. Але ўжо тое, што гэтага ката мыў старанна ў лазеньцы, намыльваючы яго і палошчучы, можа прадвяшчаць, што адчэпіцеся ад манюкаў і няшчырых людзей, „адмыеце” бруды. Астрон

„Спакойная прыстань”

31 студзеня г.г. у Бандарах (Міхалоўская гміна) афіцыйна здалі ў карыстанне Дом сацыяльнай апекі „Спакойная прыстань”. Можа ён прыняць 150 чалавек, састарэлых і з псіхічнымі захворваннямі. Зараз знаходзіцца ў ім 113 асоб у асноўным з Падляшскага ваяводства.

У „Спакойнай прыстані” працуе 80 асоб, пераважна маладых жанчын з Міхалова і Гайнаўкі. Знаходзіцца яна ў адрамантаванай гасцініцы. Экуменічную капліцу пасвяцілі каталіцкі архібіскуп Войцех Земба і епіскап Беластоцка-Гданьскай епархіі Іакаў. (яц)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пераможцы конкурсаў з апякункамі Ядвігай Кучкін (справа) і Аннай Тарасюк

Для дзяцей і моладзі

У занятках арганізаваных Гайнаўскім домам культуры ў час зімовых канікулаў з 28 студзеня па 7 лютага прыняло ўдзел звыш 200 дзяцей і моладзі.

Па некалькі разоў у тыдні вучні стракаліся на занятках мастацкага гуртка, малявалі, рысавалі і выконвалі рэквізіты на баль. У сваіх работах звярталіся да зімовых тэмаў, успаміналі летнія канікулы і малявалі герояў улюбёных казак. Дом культуры арганізаваў конкурсы, на якія працы можна было выконваць дома. Вучням трэба было фатаграфаваць сваіх жывёл, пісаць вершы і выконваць мастацкія работы на тэму „Мой горад зімой”. Першыя месцы ва ўзгаданых конкурсах занялі Кацярына Піскорская, Ада Міхалоўская, Юстына Бура і Анна Кендысь.

— Вучні ахвотна прыходзілі на заняткі, у час якіх праводзілася многа гульняў. Дзеці любяць конкурсы, — заявіла Анна Тарасюк, якая вяла мастацкія заняткі.

У час зімовых канікулаў дзеткі вучыліся танцаваць і рыхтаваліся на баль-маскарад. Спадабаліся ім дзіцячыя спектаклі „Снегавая каралеўна” і „Легенда аб драконе”, якія прадставілі акцёры з Кракава і Беластока.

Каля 150 вучняў былі ўдзельнікамі адкрытага турніра настольнага тэніса, суарганізатарам якога быў Асяродак спорту і адпачынку ў Гайнаўцы. Дзеці і моладзь змагаліся ў 5 узроставых катэгорыях. Пераможцамі ў паасобных катэгорыях сталі Давід Скепка, Андрэй Гжыбоўскі і Рышард Анішчук з Ляўкова ды Крыстыян Кардаш і Яраслаў Ляшчынскі з Гайнаўкі.

— У час зімовых канікулаў арганізавалі мы многа заняткаў, каб дзеці і моладзь адчувалі, што Дом культуры адкрыты на іх патрэбы. Сродкі, якія мы атрымалі з Супрацьалкагольнага фонду выкарысталі на арганізацыю заняткаў, узнагароды і аплату спектакляў. Спадзяемся, што ў будучыні яшчэ больш вучняў будзе прыходзіць на нашыя заняткі, — сказаў дырэктар ГДК Андрэй Скепка. (ам-з)

На сходзе ў Кузаве

5 лютага 2003 г. у Кузаве вясковы сход выбіраў солтыса. Удзельнічала больш шасцідзесяці жыхароў. Прысутнічаў войт Міхал Врублеўскі, старшыня Рады гміны Ян Купрыцюк, радны Ян Найбук, прадстаўнікі паліцыі, пагранічнікаў і Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі. Солтыс Уладзімір Раманчук даў справаздачу з чатырохгадовай дзейнасці, а войт расказаў аб мінулагодніх гмінных інвестыцыях. Прадстаўнік паліцыі паінфармаваў, што з 1 снежня мінулага года аднавіў працу пастарунак паліцыі ў Чаромсе. Цяпер 5 паліцыянтаў нясуць кругласутачную службу. А ў пагранічнікаў з мэтай павелічэння эфектыўнасці працы гранічных служб, аб’ядналі кантрольна-прапускны пункт з заставай. Капітан Бэрэзьняк заклікаў сабраных садзейнічаць у ахове дзяржаўнай мяжы. Гайнаўскія прадстаўнікі Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі расказалі пра планаваныя даплаты для сялян з еўрапейскіх фондаў і новую сістэму ўліку жывёлы ў гаспадарках.

У час дыскусіі Віктар Сідарук запытаў войта, чаму павышаецца колькасць гмінных працаўнікоў, калі ўва ўсіх прадпрыемствах увальняецца рабочых. Прапанаваў ён паліцэйскім зацікавіцца „каскадзёрамі”, якія ганяюцца вуліцай на матацыклах. Надзея Данілюк прад’явіла прапанову заняцца бяздомнымі сабакамі, якіх шмат валяндаецца па вуліцы. Уладзімір Саўчук закрануў справу роварнай сцежкі. На яго думку танней было б пакласці асфальтнае палатно, чымсьці ўкладаць бетонныя пліткі.

У адказ спадар Врублеўскі заявіў, што паколькі прыбавілася працы ў гміне наконт Еўрасаюза, дык неабходныя дадатковыя штаты. — Нікога чужога не прыняў, — канстатаваў войт — адно жыхароў сваёй гміны. — Наконт тратуара сказаў такое: — Асфальтнае палатно не так прыгожа прэзентуецца. Наш тратуар сапраўды шыкарна выглядае.

Паліцэйскія абяцалі пацікавіцца і каскадзёрамі, і сабакамі.

На солтыса былі прад’яўлены тры кандыдатуры. У час выбараў перамог сарака галасамі Раман Бішчук. Яго канкурэнты атрымалі адпаведна: 14 і 10 галасоў. У заканчэнні схода была выбрана чатырохасабовая салэцкая рада. Кузаўцы перадалі ўладу маладым.

Уладзімір Сідарук

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2003 r. upływa 5 marca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка



„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

— Сёння нават маладыя дзяўчаты ведаюць, што такое любоў, — уздыхае бабулька.

— Але пасля шлюбу забываюць, — пацяшае яе ўнучак.

* * *

Унучка пытае бабулю:

— Ці памятаеш мужчыну, які цябе ўпершыню пацалаваў?

— Даражэнькая, я ўжо нават не помню апошняга.

Факты і высновы

Паліцыя (і вытворныя)

„Палітыка" паведаміла: „Sąd Rejonowy w Poznaniu uniewinnił ostatecznie Piotra Lisiewicza, który oskarżony był o to, że wprowadził w błąd policję podając, że nazywa się Włodzimierz Iljicz Lenin".

Паліцыя паверыла ў рэінкарнацыю! І высвятленнем справы мусіў займацца суд?

* * *

Ці не таму ў навагоднім пасланні галоўны камендант паліцыі абнародаваў залатую думку: „Każdy policjant musi myśleć" (?).

* * *

І здарылася нестандартнае. У часе перастрэлкі паліцыянты спусцілі дух з бандыта, а не наадварот. І на цырымоніі ганаравання герояў прэм'ер рэкнуў інструктыўна: „Policjant powinien strzelać szybciej od bandyty".

Во дылема!

А між намі, прэм'ер — аматар каўбойскіх кінафільмаў.

Сідар Макацёр

* * *

„Маё заданне перш за ўсё — ведаць, што дзеецца ў меншасных асяроддзях, кантактавацца з імі, размаўляць, ведаць іх праблемы, патрэбы, пастулаты, і інфармаваць аб гэтым ваяводу"— сказаў „Ніве" нованазначаны упаўнаважаным падляшскага ваяводы па справах нацыянальных меншасцей (стар. 1).

Спецслужбы ў гэтай галіне і больш аператыўныя, і... больш прафесійныя.

Сцяпан Абух

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — загаловак паэтычнага зборніка Надзеі Артымовіч.

1. накрывала, якім нешта апінаюць; на Беласточчыне так называюць гумовую шыну для кола
= 21 __ 10 __ 13 __ 15 __ 1 __;

2. ежа для спажывання ў абедзенны час = 7 __ 20 __ 8 __ 2 __;

3. сталіца Аўстрыі
= 6 __ 17 __ 18 __ 11 __;

4. пярэдняя частка галавы жывёліны з губамі і ноздрамі
= 3 __ 5 __ 9 __ 16 __;

5. ліпкае рэчыва для трывалага змацоўвання прадметаў
= 12 __ 4 __ 19 __ 14 __;

Ш

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 1 нумара

Трыумф, штукар, павук, умова, Гана, герой, пена, Ліда, рапіра.

Рашэнне: **Рука руку мые, нага нагу падпірае**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Валяем у космас

Пасля трансфармацыі і натызацыі неўзабаве чакае нас яшчэ і еўрасаюзацыя з харчовай рэвалюцыяй. Выклікае гэта немалыя хваляванні за будучыню так сярод вытворцаў ежы, як і яе спажыўцоў; спрабую і я паразбірацца ў гэтых трывогах.

Фермеры Злучаных Штатаў Амерыкі вырабляюць ежу вартасцю ў 3 800 кілакалорый на кожнага жыхара сваёй краіны ў суткі. Мужчына патрабуе 3 Мкал, а жанчына 2,3 Мкал у суткі, але адной такой пары на тамашнім спажывецкім рынку прапануецца 7,6 Мкал — значыць на 2,3 Мкал больш, чым ёй трэба. Калі ўлічыць, што ў ЗША пражывае 260 мільёнаў жыхароў, тады бачна, што краіна гэтая можа пракарміць яшчэ іншых 130 мільёнаў жанчын або 100 мільёнаў мужчын. Выпадала б меркаваць, што тымі харчамі можна, напрыклад, пракарміць кожнага пятага жыхара галадаючай Афрыкі. Мо так і было б, калі б тыя афрыканцы прыязджалі сілкавацца ў ЗША. Паколькі, аднак, амерыканскія ўлады не даюць ім візаў, тады тамашнія аквізітары вырашылі грузіць тую ежу ў жываты саміх амерыканцаў. На рэкламу харчоў расходуецца ў ЗША 30 млрд. долараў у год і вытворцам ежы ўдалося перамяніць сваіх суграмадзян у жывыя машыны для перамолу сваіх лішніх прадуктаў. І каб даход ад тае празмернасці быў яшчэ большы, фермеры падсыпаюць у глебу хімікаты дзеля большага ўраджаю, а вытворцы гатовай ежы — дзеля кансервіравання; каб не было празмерных страт. І такім чынам тамашнія харчы насычаны багатай хімічнай начынкай.

Падобныя, як у багатай Амерыцы, праблемы, выступаюць і ў — здавалася б небагатай — Польшчы. З ходам гадоў я назіраю, што ўжо нават маё пакаленне грузіць штораз больш хімікатаў у свае страваводы. Некаторыя старэйшыя людзі нават стаюць на своеасаблівым раздарожжы: якую частку свайго бюджэту несці ў спажывецкую краму, а якую ў аптэку. А калі хто яшчэ ў якую Пятроўку або Піліпаўку шчыра запосціць, тады ўжо запраўляецца толькі фабрычным палівам, быццам паравоз або ракета. Гэта амаль так як у Амерыцы, дзе некаторыя жыхары Новага Свету могуць заявіць, што іхнія любімыя спажывецкія араматы паўстаюць у фабрыцы, якую бачаць з аўтастрады.

На беластоцкім базары па вуліцы Юравецкай была мясная крама сельскагаспадарчага прадпрыемства „Рольмак" з Макаўкі, якая прадавала добраякасныя прадукты з амаль паловы нашай Гайнаўшчыны. Цяпер тае крамы там няма, бо пакупнікі сталі купляць танныя мясныя вырабы з праезжых самаходаў; мо лепш не думаць, чым тыя вырабы насычаны. Таксама вялікія магазіны міжнародных гандлёвых сетак заманьваюць нас нізкімі цэнамі і бліскучымі ўпакоўкамі; не буду падазраваць, якая ў іх начынка. Гэтыя магутныя сеткі нахабнічаюць яшчэ і надомнай рэкламай, прапануючы гэтак званымі прамоцыямі выцягнуць ад нас усялякія грошы за розную непатрэбшчыну; гэта дакладна так, як і з тымі калорыямі ў Амерыцы.

Калі зноў пайшла гаворка пра Амерыку, дык варта згадаць, што 60% тамашняга насельніцтва пакутуе ад укормленасці і надвагі. І гэта зноў дае штуршок для ўводу ў арганізм чарговых хімікатаў — тых, якія маюць выдварыць тую лішнюю тлустасць...

Часам гаворыцца ў народзе: чалавек не свіння — усё з'есць. Дзмітры Бутакоў з расійскага Ліпецка папівае тормазную вадкасць і ацэтон ды закусвае гэта ядавітымі грыбамі, а ягоныя таварышы сцвярджаюць, што гэтакім чынам імунізавалі свае арганізмы ад язвы страўніка, туберкулёзу і СНІДа. Вось якая аптэка ў наш касмічны час!

Наша зямное асяроддзе штораз больш забруджваецца хімікатамі і быць можа чалавеку давядзецца здзейсніць свае спрадвечныя мары: імуналізавацца і перасяліцца на мо яшчэ чысты Марс ці і далей. Сёння ж ужо, як паказваюць навейшыя падзеі, лягчэй паляцець у космас, чым вярнуцца адтуль.

Аляксандр Вярбіцкі

Я ў „Баабабе"

Запрасіла мяне, як адзінага мужчыну, на сустрэчу ў клубе „Баабаб" мая маладая сяброўка Гануля. Ну, не думайце, шаноўныя чытачкі, што я так хаджу сабе там-сям з нейкімі сяброўкамі, да таго маладзюсенькімі, а сваю Агату дома ў суме пакідаю! Не-не! Агата мяне пусціла на тую сустрэчу ў клубе „Баабаб", і тую Ганулю ведае, і бабаў з клуба „Баабаб" таксама. Значыць, у той клуб маюць уступ мужчыны, калі іх запросяць. Але, мабыць, трэба мець шмат адвагі, калі ідзеш туды як на якую катаргу ці на галавасячэнне. Можаце сабе ўявіць такое пасяджэнне з тузінам Монікаў Алейнічых, якая тою „кропкай над і" крапае ды крапае табе ў мазгі, да таго кожная як на карцінцы, а тая сексуальная прастрэлінка ў пярэдніх зубах проста заварожвае субяседніка, што той з'язджае з глузду! Ну, не ўсе бабы ў „Баабабе" даўгавалосыя бландзінкі сярэдніх (ужо!) гадоў, якія, як то кажуць, добра трымаюцца. Ёсць і рашучыя брунеткі, і нават тры рудыя (адна з іх, на маё вока, фарбаваная, бо для рудасці трэба мець і свой характар). А мне якраз такія найбольш падабаюцца, хоць і з цалкам маладымі маю адвагу пагаварыць, а яны мяне трактуюць не як дзеда...

— Як ні гавары, дзед ты ўжо, — пасміхнулася мая Агатка. — Таму я цябе магу пускаць, куды хочаш. Толькі піва халоднага не пі.

І вазьмі ты не злуйся — ні каліва зайздрасці няма ў мае жонкі. Бо і падстаў няма. Як звянчалі — так і да канца. Шкада, што так во адны калякаем, без уласных дзетак. Ну, тыя дзеткі ўжо самі былі б дзядамі, калі б нам Бог іх даў... Ну, што тут я пра дзяцей! Пачаў жа ж я пра клуб „Баабаб"!..

Думаю, надзену я свой найлепшы касцюм, той, куплены ў беластоцкім „Цэнтралі" пазалетась. Шыкоўны, акуратны. Ну, элегантны, адным словам. У самы раз на дзеда?! У такім то не толькі на імпрэзу якуюсь ісці, а нават... хоць у труну кладзіся... Апрануўся — не! Надта ж я ім джэнтльменскі і... стары. Праўда, хоць ты ў дамавінку... І да таго строгі воблік я ўчыніў у люстэрку, бліснуў пантофлямі (давялося перад трумо выскачыць галубца! — аж трэснула штосьці ў кліне). О, не туды дарога!

Уціснуўся я ў новыя джынсы. Мабыць, лепшыя былі б тыя выцертыя, выпалавелыя... Не, буду ў гэтых, новых. Блакітная, „прэзідэнцкая" кашуля (гэта пад мае, блакітныя, хоць бляклыя ўжо вочы), на гэта — шэры ваўняны швэдар...

— Агата, дзе той швэдар у алені?

— Сам ты алень! Што ты выпендрываешся? Думаеш паненак рваць, ха-ха-ха? На „ляску" трэба мець іншыя прывабнасці, і машыну не такую...

Сам я знайшоў той нарвежскі швэдар, якім я так ганарыўся ў Закапанэ, і, усё ж, рваў тыя ляскі. Ведай ты, Агаціішча, што не такі Вандал стары ўжо!

У клуб „Баабаб", усё ж, паехаў не сваім старым „Паланезам", а аўтобусам. Выйшаў нават раней на адзін прыпынак, прайшоўся. Хай думаюць, што я дбаю пра здароўе.

Прывітала мяне Гануля ўжо ў дзвярах: чакала! Рукі першай не падала — гэтак вітаюць асабліва паважаных асоб, вось, сеніёраў, з павагай: тая асоба першая працягвае руку таму, каму хоча. Нават распрануцца памагла, як якому старэчу.

— Ой, спадар Вандал... — акінула дзеўка вокам мае джынсы і „кулёвы" швэдар. — Мы запрасілі вас, каб вы далі нам даклад пра этыкет ды элегантнасць.

Вандал Арлянскі

ISSN 0546-1960